

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Залатыя рукі нашых продкаў
ЛЮДМІЛА ГРЫГАРУК ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 8 (2493) Год XLIX | Беласток, 22 лютага 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Чый музей?

Мікола Ваўранюк

Янка Хіліманюк (шматгадовы старшыня Грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея): Людзі на вуліцы ў Гайнаўцы пытаюць, што тут робіцца, хто хоча пераняць музей?

Самае цікавае, што папраўдзе нічога асаблівага не робіцца. Адно прагучалі словы. Ян Сычэўскі — старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства, а заадно сябра Управы Падляшскага ваяводства — запрапанаваў, каб гайнаўскі музей стаў філіялам Падляшскага акруговага музея. Паводле яго, была б ад гэтага падвойная карысць. Беластоцкія музейнікі памаглі б наладзіць прафесійную працу ўстановы, па-другое: фінсавалася б яна з бюджэту маршалка Падляшскага ваяводства.

— Беларускі музей у Гайнаўцы ад пачатку перажываў вялікія цяжкасці, перш-наперш з-за недахопу грошай, — характарызуе 20-гадовы перыяд пабудовы Ян Сычэўскі. — У 1996 годзе здавалася, што яны канчаюцца. Камітэт пабудовы, Беларускае таварыства і прадстаўнікі польскага ўрада падпісалі трохбаковае пагадненне, паводле якога музей меўся стаць дзяржаўным. З таго часу становішча ўстаноў культуры ў Польшчы, аднак, рэзка змянілася. У 1998 годзе, разам з адміністрацыйнай рэформай, амаль усе дзяржаўныя культурныя ўстановы перайшлі ў кампетэнцыю мясцовага самакіравання. Таму лічу, што пераход музея ў бюджэт маршалкоўскай управы, гэта найлепшае выйсце. Ваяводскае самакіраванне мае магчымасці ўтрымаць такую ўстанову і пры добрай волі запэўніць ёй функцыянаванне.

А што, калі Падляшскім ваяводствам стануць кіраваць людзі, у якіх такой волі не будзе?

— Будзе падпісана доўгатэрміновая дамова, якая забяспечыць інтарэсы музея, — кажа Ян Сычэўскі. — Але вядома, калі хтосьці кіруецца злою воляй, то заўсёды знойдзе спосаб, каб такую дамову парваць. Я аднак застаюся аптымістам. Веру, што да ўлады ў нашым ваяводстве не прыйдуць людзі варожа пастаўленыя да нацыянальных меншасцей.

Хаця не ўсе ў нас такія аптымісты, аднак не сама прапанова падпарадкаваць музей маршалкоўскай управе спарадзіла погаласкі пра спробу яго *прыхватызаваць*.

— Нельга нам адкінуць такую прапанову, — кажа бурмістр Гайнаўкі. — Пабудова музея закончылася. Цяпер трэба, каб гэтая важная для горада ўстанова працавала поўным ходам. Супольна з ваяводскім самакіраваннем будзе можна хутчэй гэтага дабіцца. Адно з такой умовай, што Падляшскі музей будзе арандаваць памяшканні ў Гайнаўцы на статутную дзейнасць, гэта значыць — прапагандаванне беларускай культуры. **Права ўласнасці будынка мусіць застацца ў Гайнаўцы, за тымі людзьмі, якія будавалі музей**.

„Права ўласнасці" — якраз гэтае і выклікала апошнія кантраверсіі. Яшчэ летась як быццам усё было яснае. Зямля, на якой стаіць Беларускі музей належыць Беларускаму грамадска-культурнаму таварыству (на прынцыпах вечнага карыстання), а сам будынак — Грамадскаму камітэту пабудовы. Але з канцом мінулага года пабудова афіцыйна закончылася, а Камітэт пераўтварыўся ў таварыства Музей і асяродак беларускай культуры. У Гайнаўцы лічылі, што новаствораное таварыства з'яўляецца паўнапраўным спадкаемцам Камітэта. Публічна аспрэчыў гэта Ян Сычэўскі ў інтэрв'ю Беластоцкаму радыё 30 студзеня:

— **Уласніка будынка пакуль няма. Думаю, што будзе ім найбольш прадстаўнічая для беларускага асяроддзя арганізацыя.** Якая? Пакуль не магу адказаць на гэтае пытанне, — у эфіры было чуваць смех старшыні, які падказваў, што адказ усё-такі ён ведае.

Дзеля выяснення спрэчных пытанняў спаткаліся 4 лютага ў Гайнаўцы старшыня Беларускага таварыства Ян Сычэўскі, бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк, стараста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочук і дырэктар Беларускага музея Янка Карпюк. Пасля сустрэчы гайнаўляне былі ўпэўнены, што пераканалі Сычэўскага ў сваіх правах да будынка. Але ён выходзячы з сустрэчы перад камерай Польскага тэлебачання падтрымаў сваё ранейшае меркаванне:

— Зямля і стары будынак належаць Беларускаму таварыству, а справа ўласніка новага будынка будзе вырашацца паводле польскага права.

* * *

— На тое, што ў Гайнаўцы ўзнік Беларускі музей склаліся некалькі прычын, — кажа Васіль Сакоўскі, які быў пры яго пабудове ад пачатку. — Па-першае, у нас быў і ёсць адданы справе беларускі актыў, па-другое, тут жыве Канстанцін Майсеня, які змог запаліць людзей да гэтай ідэі. І па-трэцяе, у нас было трохі шчасця. Тут была руіна пасля тартака. Будынкі нішчэлі, абсталяванне расцягвалі, улады за тое падвяргаліся крытыцы. Таму яны ахвотна пазбыліся клопату і перадалі нам пляц і знішчаныя будынкі. Цяпер мы такога пляца ў цэнтры горада не атрымалі б і такога музея не пабудавалі б.

— Пра нас гаварылі, што мы будуем музей сабе, — кажа іншы ветэран пабудовы Аляксей Харкевіч, — а мы ж яго будавалі наступным пакаленням. Ужо відаць, што паўстаў прыгожы цэнтр беларускай культуры. Павінен ён быць свайго роду святасцю для ўсіх беларусаў.

Прафесар Аляксандр Баршчэўскі, які ахвяраваў на пабудову ці не найбольш грошай, нават прыгразіў, што калі музей стане ўласнасцю толькі аднае беларускае арганізацыі, падасць справу ў суд.

Бурмістр Анатоль Ахрыцюк паўтарае:

— Пакуль я на сваёй пасадзе, не дапушчу, каб права ўласнасці выйшла па-за Гайнаўку.

Мікола Ваўранюк

Наступ замест акопаў ☞ 2

Сакрат Яновіч

Здзіўляе мяне, што ніхто ў Мінску ці Беластоку — за амаль усё дваццатае стагоддзе — не спрабаваў наладзіць выпуск перыёдыка прызначанага прэзентацыі беларускай культуры ў свеце, на мовах прынамсі еўрапейскіх...

Дзіцячы перыяд ☞ 2

Яўген Мірановіч

Капіталізм у Беларусі неяк не можа выявіць адкрыта свайго рыла, хаця выразна заўважаецца яго прысутнасць. Сярод шэрай архітэктуры брэжнеўскай эпохі віднеюць новыя будынкі, якія эстэтыкай выканання вылучаюцца ад кашмарнага савецкага жыллёвага будаўніцтва...

Кропкі над „і" ☞ 4

Анатоль Маўчун

Схільнасць дзяржаў да пашырання сваіх межаў, або ўплыву на суседзяў, з'ява не новая. Немцы, Аўстрыя і Расія дзялілі Польшчу і зараз жа пачалася германізацыя і русіфікацыя польскага насельніцтва. Пасля адраджэння (і пасля I і II вайны) Польшчы палякі неадкладна ўзяліся паланізаваць усіх — каб мець народ аднародны...

„Пераборшчванне" ☞ 5

Мацей Халадоўскі

Я ўсё больш расчараваны амерыканскай палітыкай. Не без прычыны тут, пэўна, сапраўдная паводка інфармацыі, якая сплывае на мяне галоўным чынам з польскіх радыё і тэлебачання...

Вогненнае памежжа ☞ 8

Саветы так мучылі людзей, што не дай Бог! Каб яшчэ год, то і не вытрывалі б. Трэба было каменне на аэрадром у Заблудаў вазіць і даваць абавязковыя пастаўкі. Збожжа людзі везлі ў Беласток, а там жыды яго па двое сутак прымалі, „ваўкоў" шукалі...

Беларускія спартсмены ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

Найбольшы поспех з беларусаў выпаў на долю гімнасткі Ларысы Петрык, якая заваявала два залатыя медалі (у камандавым заліку і ў вольных практыкаваннях) і адзін бронзавы...

Занатоўкі кантрабандыста ☞ 10

Сымон Нальшанскі

— Ці не казаў табе не называць мяне панам. Я з Белавежы. Мы тут усе беларусы. Я дзяцей сваіх лупцую, каб гаварылі па-нашаму. А цябе зараз закапаю за такое. Зразумеў ці не?..

9 770546 196000

Таямніцы Маракеша і Белавежжа

Аднойчы спытаўся ў мяне галоўны рэдактар „Нівы”:

— Ты чытаў апошні нумар „Жыцця Варшавы”? Не? Дык прачытай! — і паказаў мне артыкул „Wniebowzięci”, прысвечаны леташнім замежным падарожжам польскіх парламентарыяў. Я ўзяўся за газету. Аслупянеў не менш чым рэдактар. Аўтарка сцвярджала: „З парламентарыямі Беларусі нашы дэпутаты сустрэліся ў... Маракешы, марокскай «Жамчужыне Поўдня»”. Чаму якраз у Маракешы? — у здзіве запытаўся я сам у сябе. Пазваніў адразу падляшскаму дэпутату Яўгену Чыквіну, старшыні польска-беларускай парламенцкай групы. А раптам даведаюся аб дэталях гэтай таямнічай сустрэчы?

— Аб гэтым я нічога не ведаю, — пачуў. — Здаецца мне гэта быць малапраўдападобным. Маршалку Сейма Марку Бароўскаму той славуты вуж у кішэні таксама здох ад голаду.

Анекдатычныя тлумачэнні дэпутата Чыквіна не давалі мне, аднак, спакою. Скантактаваўся тады я з прэсавым бюро Сейма.

— Ой, я ж нічога не ведаю. Можа, аб гэтым ведаюць у парламенцкай заходне-арабскай групе? — накіравала мяне туды працаўніца таго бюро.

Ад чыноўніка сакратарыята заходне-арабскай групы я даведаўся: сустрэча ў Маракешы не адбылася ў мінулым годзе, а два гады таму. Тады само праводзілася міжпарламенцкая канферэнцыя 138 краін свету (склікаецца яна два разы ў год, у розных краінах). Польскія парламентарыі сустрэліся з калегамі — парламентарыямі з Беларусі, але таксама і з іншых дзяржаў. Сенсацыя „Жыцця Варшавы”, вось, не пацэлена. Да таго маю ўражанне, што аўтарка тэксту (рэдакцыя?) падманіпулявала факты пад атракцыйна гучаўшай тэзай, якая была акрэслена на самым пачатку: „парламентарыі маюць ідэю на бясплатнае наведанне найбольш экзатычных краін”. Толькі нашто мяшаць праблему і выкарыстоўваць для такой тэзы цяжкія беларуска-польскія рэляцыі?

Калі ўжо растлумачыў я „справу Маракеша”, трапіў мне ў рукі тыднёвік „Палітыка” і артыкул Яцка Жакоўскага, прысвечаны шэфу польскага МЗС Владзімежу Цімашэвічу, падляшскаму дэпутату, чалавеку з Белавежскай пушчы. Тэза: „Штораз часцей — хоць галоўным чынам па кутках — чуецца таксама, што адной з праблем польскай замежнай палітыкі з'яўляецца міністр Владзімеж Цімашэвіч”. Праўда, ці не цікавая крыніца інфармацыі — тыя „куткі”? Далей прачытаў я: „У нейкім сэнсе Цімашэвіч — чалавек слушных і пройгрышных спраў. Часта мае ён рацыю і аднолькава часта не ўмее яе ажыццявіць”. Яцак Жакоўскі сумняваецца, ці міністр Цімашэвіч сумее дастаць Польшчу, як гэта акрэслівае, з бігасу, пасля сарвання дыялога з Еўропай. Усё, як можна зразумець з ягоных доказаў, з-за індывідуальнасці міністра. Тут, спасылаючыся на размовы ў Бруселі, акрэслівае яго: „сухі, арагантны, цвёрды, *sztywniak*”. Як бы для процівагі, Жакоўскі заўважае, што ў доме пад Белавежай ён: аўтэнтычны, верагодны, адкрыты, інтэлігентны, дасціпны, сумленны і рацыянальны.

Не буду спрачацца, ці індывідуальнасць не мае ўплыву на дыпламатычныя адносіны ў замежнай палітыцы. Аднак гэта справа другарадная. У гэтых рэляцыях лічацца перш за ўсё *sztywne* інтарэсы, якія вынікаюць, дарэчы, з абароны лакальнай гаспадаркі і рынку. Ведаю, што тая падвойная брусельска-белавежская індывідуальнасць міністра Цімашэвіча вядомая не толькі рэдактару Жакоўскаму. Мог не толькі тую „сухасць”, але і падбелавежскую адкрытасць спазнаць хоць бы міністр замежных спраў Нямеччыны Ёшка Фішэр, прахаджваючыся з ім па Белавежжы неафіцыйна. Можа таксама там — аб чым, мабыць, не ведае Яцак Жакоўскі — змагаецца з акрэсленым рэдактарам „Палітыкі” ценем еўрапейскай дэзінтэграцыі.

Падбелавежскія спатканні, аднак, з пункту гледжання варшаўскай журналістыкі, аднолькава экзатычныя, а затым — няўцямныя, як уяўныя польска-беларускія сустрэчы ў Маракешы.

Мацей Халадоўскі

Наступ замест акопаў

У другой палове студзеня выйшаў з друку ўжо пяты том штогодніка для Еўропы „Annus Albaruthenicus — Год Беларускі”. Можна сказаць: малы юбілей выданню. Пяты год менавіта дзейнічае яго эдытар, Згуртаванне Villa Sokrates у Крынках на Сакольшчыне (заснаванае ўвесну 1999 г. сябрыною нашых беларускіх інтэлігентаў). Статутная мэта — засвойванне беларускай культуры еўрапейскай і, адначасна, яе еўрапеізацыя, асабліва літаратуры (аднабакова пахіленай да расейскай). Мы не зазналіся і разумеем свае, надта скромныя, магчымасці ў гэтай матэрыі, але важны тут якраз сіндром пачатку.

На арэале беларускай мовы нямала выдаецца перыёдыкаў — месячнікаў, квартальнікаў, гадавікоў — але ўсе яны накіраваныя на ўнутранае інтэлектуальнае і мастацкае жыццё. Няма экспансіі. Свядомыя беларусы моцна заклапочаныя нацыянальным выжываннем ва ўмовах калоніі. Будучы заглядженымі на свае праблемы, жывуць яны ў некаторай самаізаляванасці ад шырокага свету. А той жа свет сам не дадумваецца існавання беларускай нацыянальнай культуры, літаратуры. Сумная канстатацыя, бо аніякая нацыянальная культура не ў сілах развівацца без міжнародных сувязяў, плыні адкрыццяў ды ідэй. Прыходскі нацыяналізм знішчае культуру.

Здзіўляе мяне, што ніхто ў Мінску ці Беластоку — за амаль усё дваццатае стагоддзе — не спрабаваў наладзіць выпуск перыёдыка прызначанага прэзентацыі беларускай культуры ў свеце, на мовах прынамсі еўрапейскіх. Каб вылезці з беларускіх абарончых акопаў і пайсці ў наступ. Нам не хапае экспансіўнасці. Мы не абжылі замежжа, седзячы, бы тыя мележаўскія „Людзі на балоце”... Пагаджаемся, што нікому мы не патрэбныя, акрамя каланізуючых нас. Гэта ж сярэднявечча!

Трэба аб'ектыўна прызнаць, што выдаванне „Году Беларускага” раней аказалася б ініцыятывай дорага каштуючай ды вымагаючай значных клопатаў. Тэхніка, аднак, шалёнымі тэмпамі ідзе наперад і сёння, паўжартам кажучы, можна выдаваць такое нават у вясковай хаце. Даволі мець аўтарскі аўтарытэт, прызнанне ў некаторых колах у Еўропе, мабілізуючы адтуль аўтараў зацікаўленых беларушчынай. А такія знаходзяцца — немцы, ангельцы, французы, шведы, венгры, урэшце палякі. „Год Беларускі” задуманы як трыбуна для іх, каб, дзякуючы іхным публікацыям, рушыць са словам пра Беларусь і беларускае ў глыбіні еўрапейскай культуры. Вядома, выходзяць жа ў перакладах кніжкі беларускіх пісьменнікаў такога фармату, як Быкаў або Разанаў. Кніжка, аднак жа, іначай функцыянуе ў грамадстве, чымсьці рэгулярны перыёдык, зарыентаваны на папулярызацыю.

„Год Беларускі” стаўся пастаянным месцам публікацыі і беларускіх перакладаў з заходніх літаратураў. Нам, беларусам, трэба ведаць, хоць упрысмак, крыху літаратуры французскай, іспанскай, італьянскай, дацкай, фінскай, амерыканскай; ведаць толькі расейскую і польскую — гэтага мала, вельмі мала культурнаму чалавеку.

Сакрат Яновіч

Фота МІХАЛА КОСЦЯ

Трыялог 2003 — арганізаваная Вілай Сакрат сустрэча беларусістаў свету

Дзіцячы перыяд беларускага капіталізму

Пасля ўвядзення візавага рэжыму ўдалося мне ўрэшце выбрацца ў Беларусь. Не быў я там амаль восем месяцаў. Цікава было як новая сітуацыя паўплывала на памежны рух. Структура кантрабанды тавараў не памянялася. У Польшчу беларусы вязуць папяросы і танныя імпартныя спіртныя напоі. Беларуская гарэлка, пасля паніжэння цэнаў на гэты тавар у Польшчы, стала малаканкурэнтнай. З Польшчы вязуць амаль усё, што прадаецца ў вялікіх супермаркетах — ад зубной пасты па тэлевізары і халадзільнікі. У Беларусі гэтых тавараў хапае і яны нават таннейшыя, але больш прэстыжна лічыцца мець дома тэлевізар „Панасонік”, чым „Гарызонт”. На мяжы палякі вяртаюць 22 працэнты заплачанай цаны, у якасці падатку ПДВ, што псіхалагічна вельмі заахвочвае да пакупкі большай колькасці тавараў.

Паводле слоў гродзенскіх калегаў, штодзённае жыццё жыхароў Беларусі моцна ўскладнілася апошнім часам. Растуць цэны, зарплаты стаяць на месцы. Усе наракаюць. Нібы нічога новага ва ўсходняй Еўропе. У такім стане грамадзяне Польшчы жывуць дзесяткі гадоў. У гродзенскіх крамах крызісу не відаць, але заўважаецца значна меншая колькасць пакупнікоў. Беспрацоўе, паводле афіцыйных даных, толькі 3-працэнтнае, аднак шмат працуючых выконвае працу, якой не патрабаваў бы прыватны ўласнік фірмы, напрыклад, у прадуктовай краме, дзе невялікую колькасць пакупнікоў маглі б абслугоўваць дзве прадаўшчыцы, працуе іх дзесяць. Не абазначае гэта, што пакупнік можа хутчэй набыць прадукты. Калі хочам, напрыклад, купіць хлеб, малако, мінеральную ваду і кавалак каўбасы, трэба пастаяць у чатырох чэргах, таму што жанчына, якая прадае булкі і хлеб, не можа нам прадаць малака, хаця яно стаіць каля яе.

Раздражняць можа таксама рэгламент працы крамаў. Прадуктовая адкрываецца, напрыклад, у 8 гадзін раніцы, а свежы хлеб ці булкі прывозяць каля абеду. Найбольш невыносныя бываюць перапынкі ў абеднюю пару. Асабліва цяжка зразумець перапынак на абед, які аб'яўляецца супрацоўнікамі рэстаранаў. У гэты час яны павінны несці паслугу ўсім грамадзянам, якія хочуць паесці, а тым часам дзверы рэстаранаў закрытыя. Можна тады ісці ў прыватны бар ці кафэ, дзе служаць абедам. Але там па невядомых прычынах цэны ў 3-5 разоў вышэйшыя, чым у дзяржаўных, а прытым якасць абслугоўвання і прадуктаў нічым не розняцца. Суп, назва якога ў меню італьянская, аказваецца быць быстрасупам, які ў Польшчы называецца „Gorący kubek. Barszcz z grzankami”.

Капіталізм у Беларусі неяк не можа выявіць адкрыта свайго рыла, хаця выразна заўважаецца яго прысутнасць. Сярод шэрай архітэктуры брэжнеўскай эпохі віднеюць новыя будынкі, якія эстэтыкай выканання вылучаюцца ад кашмарнага савецкага жыллёвага будаўніцтва. Капіталізм асабліва заўважаецца на ўскраінах горада, дзе ўзводзяць сабе катэджы найбольш прадпрымальныя грамадзяне Беларусі. Звонку будынкі можа выглядаюць не надта багата, але ўнутры — швейцарска-аўстрыйскія стандарты. Гэта дамы не карумпаваных чыноўнікаў ці мафіёзі, але ўласнікаў малых крамаў, гандлёвых пасрэднікаў, дробных прадпрымальнікаў. Цана ўтрымання будынка велічынёю каля трохсот квадратных метраў жылой плошчы ў 5-6 разоў ніжэйшая чым у Польшчы. За кошт горада ці дзяржавы выконваецца таксама ўся інфраструктура — водаправоды, газаправоды, электрычнасць. Кошт усяе інвестыцыі ніжэйшы ў 3-4 разы чым у Польшчы.

Найбольш мяне ўразіла тое, што калега, паказваючы свой дом, адкрываў усе дзверы не маючы ніводнага ключа. Проста ён нічога не замыкаў. Дома знаходзіліся падрыхтаваныя дошкі на падлогу, шмат будаўнічых матэрыялаў. На маё здзіўленне ён адказаў: „А хто сюды прыйдзе, каму яно патрэбнае, дарэчы, суседзі зараз заўважылі б, што нехта чужы круціцца”. Асабліва гэты факт паказвае, што ў беларускім грамадстве існуе патэнцыял для пабудовы эканомікі на здаровых падставах. Дастаткова не перашкаджаць народу, даць яму магчымасць спакойна працаваць. Гэта так мала, а адначасова так далёкая мэта.

Яўген Міранові́ч

Горкі шакалад

Ева Сцепанюк

Хоць Цімоху С. больш за дзевяноста, як смала ліпне да жанчын.

— Такі жэшкі да баб, — смяюцца ў Н. і між словамі адчуваецца зайздрасць.

Раз у месяц, звычайна ўжо ў дзень калі пісьманосец прыносіць *рэнту*, Цімох С. апранае чыстую кашулю і шкарпэткі, надзявае спартовы капялюш (да фуфайкі і фільцаў-гумоўцаў), *бярэ* па дарозе ў магазіне шакалад і як кажуць у Н. — ідзе ў шкоду.

Дзевяць удоў і...

Як разведацца ў так далікатнай справе? Тэлефаную знаёмай, якая жыве ў Н.

— Прыязджай пад канец месяца, — запрашае Галя С. (бо ў Н. амаль усе прозвішчы на С.), — той дзядзька тады пры грашах, або *быдлуе*, або ў бары выпівае...

Чамусьці налятае на мяне ляк, бо ў парафіі дзе Н., людзі мруць як мухі — за апошнія тры месяцы трыццаць чалавек пахавалі.

Знаёмая заліваецца смехам:

— Czort go nie weźmie.

Хоць у Н. вядзе асфальтаваная дарога, цяжка дабрацца сюды на дзяржаўным транспарце. Іду яшчэ пешшу тры кіламетры, з боку цямнее сцяна пушчы. На замерзлай азіміне пасвіцца статак кароў, які здалёк чамусьці здаецца мне лясной звярынай, хіба зубрамі.

У Н. дзевяць удоў, адзінаццаць старых кавалераў, двух разводнікаў, двух удаўцоў, дванаццаць сужонстваў, дзве паненкі, трох хлопцаў, пяцёра дзетак і былая настаўніца-вар'ятка — так празываюць Галю. Трыццаць хат і *склеп* разам з піўным барам. Вясковая святліца закрытая на жалезны замок.

— Коб нэ тая рэнта, то нам бы... капітуляцыя была, — прызнаецца Галя. Галя ад трох гадоў рэнтыстка. Лячылася ў Харошчы. Жыве з мамай багамолкай-пенсіянеркай.

— Найгорш, што культуры бракуе, — наракае гаспадыня паміж кавай і пернічкамі-„дэліцыямі". Хоць якраз у тэлебачанні ідзе адукацыйная перадача пра імпрэсіянізм, Галя сумуе за вялікім светам і прыгожымі мужчынамі.

— Асталіся такія што то град нэ добіў. — І дадае: — Секс мяне не цікавіць. Przestań! — пасля тэатральна трасецца як у ліхаманцы.

— Яны, — кажа пра мясцовых хлопцаў, — як з таго фільма: „odrażający, brudni, źli".

То многа ад кабеты залежыць

— Ваш сусед Славік С. цалкам файны хлопец, — кажу ўголас. Мама Галі хапаецца за галаву.

— Лепш сабе камень на шыю прывязаць і ўтапіцца, як за такога замуж ісці, — махае рукамі бабуля. — Як падап'е, шалёны робіцца. Маці навокал хаты з сякерай ганяў, каб рэнту на выпіўку аддавала.

Славік сёння цвярозы і вельмі рады, што напішам пра яго ў нашай газеце.

— То многа ад кабеты залежыць, — кажа Славік, стары кавалер і няздзейснены музыкант. Як па забавах іграў, то дзяўчаты самі прасіліся. Апранаўся для іх модна, кожны дзень мыў зубы. І выпіваў з толкам — так каб не валяцца засцяным.

І цяпер Славік не наракае.

— Як якая ўдава трапіцца, то што — выганіш? Прыйдзе з гарэліцай, глядзіць як анёл. Прытуліць, пашкадуе. То і *абярну*, не думаючы, гэта значыць пра якую з тэлевізара думаеш...

Славік жыве сам (бацька памёр, маці ўцякла жыць да сястры ў Беласток) і толькі ў тэлевізары мае разрыўку. Сексуальная праблема проста „выє" ў хаце недаваранага музыканта. Сцены абклееныя парнаграфічнымі плакатамі, на падлозе валяецца гармонік, у кутку гітара з парванымі струнамі. На паліцы здымкі былых нарачоных. Разам і беларускі спеўнік „Гарыць вогнішча". Славік ведае ўсе беларускія песні. І каб не кідаць слоў на вецер, бярэ гармонік і як салавей заводзіць „Беларусачку".

— А ў табэ ж сідіела одна з Гродна, — дапікае Славіку Галя. — Каця, ці як там ёй было?

— Коб жэ ў „Toto-Lotka" выйграў, — марыць уголас музыкант, — то бы і дзісь сідіела...

Успамін Каці кусае Славіку сэрца, яго чырвоны нос робіцца фіялкавым.

— Ай, паскуды, — папракае нас гарманіст і земляроб з мусу. — Вы лепш бы мне паперы „да уніі" дапамаглі запоўніць.

Прыгажэйшай не бачыў!

Пасядзенкі ў Славіка гэта частка нашага плана. Пасля чарговай кавы ідзем праветрыцца, што на практыцы значыць — спяшым у вясковы бар „Амазонка". У Н. лепш не хадзіць у бар самотным жанчынам.

— Цімох С. нашу *склепову* малестуе, — смяецца Галя. — Стане за прылаўкам і цмокча абсуслены. А яна — што можа? Хіба што анучай па зубах час ад часу такога лясне.

— То зубы яшчэ мае?

— Э, э... — папраўляецца Галя, — пратэз, значыцца.

У магазіне-бары грыміць на ўвесь голас тэлевізар. Да абрускоў ліпне пасуда. — Цімох С. быў, але пайшоў... хіба да Шуркі, — думае ўголас рыжавалосая склепова Алька. — *Nic tu nie wskórał*.

Кліентаў сёння вымела. Толькі Владак Максімкаў храпе за столікам. На зямлі валяецца згрэбленая настольніца і нельга яе падняць, бо кліент прытаптаў абрусок чобатам.

— Ну як да мяне Цімох заляцаўся? — хіхікае Алька С. — Купіў шакалад „Мільку" і паўтараў, што прыгажэйшай як я ў жыцці не бачыў. З культурай. Раз толькі прасіў, каб дала. Сто злоты, — кажа, — заплачу. — То я яму: — Дзядзьку, а можа вам якую з секссервісу? Цімох С. плюнуў з агідай:

— Мне, каб кабета свойскай гадоўлі была.

Можа праз тыдзень вернецца

Славік С. нагамі і рукамі хоча ўлезці ў мой рэпартаж. Пайшлі да Цімоха! Ну... нібыта да яго ўнука Ромка.

— Напрыклад, — камбінуе спявак, — спытаем, ці ўжо паперы да уніі запоўніў?

— Кава ці гарбата? — вітае нас крыху напалоханы Ромак С. — A, może, coś mocniejszego? (У Н. пры незнаёмых часам гавораць па-польску).

— А дзе ваш дзед? — асцярожна пачынае наш гід.

— Быдлуе! — адрэзвае злосна ўнучак старажыла. Ромак, сам стары кавалер, глядзіць на гадзіннік з зязюлькай.

— Можэ заўтра, можэ за тыждэнь вэрнэццэ. Аж нэ прап'е эмерытуру. Ну, усёй не бярэ, пакідае палову ў хаці.

У задбаным доме Цімоха С. на акне квітнеюць у вазонках кветкі. Старажыл жыве з сям'ёй сына. Пакойчык свой мае. У блуд пайшоў, — як пасля скажа, — з мусу. Як пакінула мілая Уляна. Значыць... памерла. — Чалавек без жонкі як змалочаны сноп, нічога не варты. Ляжыць дзень і ноч, марудзіць... Ні есці, ні спаць, нічога не хоча.

У сям'і Цімоха С., хоць усе гарачыя да мілавання (тут Галя раскажа многа прыкладаў), папракаюць старажыла.

— Шляецца як у васемнаццаць гадоў! Замест каробкі і кошыкі каля печкі плесці, — скардзіцца сын Цімоха С., ужо пенсіянер.

З шакаладам у кішэні

У канцы трапім да Шуркі С., удавы-алкагалічкі. Шурка папала ў лапы нячыстага пасля смерці свайго Колі. Муж пакінуў яе ў сорак пяць гадоў і ўжо дванаццаць Шура адна гаруе на свеце. Адзіны сын, радасць і ўся надзея, з'ехаў у Амерыку. Унукі як звоняць, то па-англійску гергечуць.

У кухні ўдавы выбітае акно. Дзірка заткнутая бруднай падушкай. На падлозе, якая ад бруду падобная на ток, валяюцца пер'е і косці. Шурка таксама напамінае вядзьмарку, хоць на яе далікатным абліччы сляды даўняй прыгажосці.

— Цімошка? Стаміўся, бядак, — засланяе сабой уваход у пакой кабета. — Хай паспіць чалавек.

— А, можа, напіўся? — штурмам ідзе Славік на хату. Мы з Галяй адцягваем яго за рукавы (у Н. кажуць, што Славік і Шурка даўно ўжо знюхаліся).

— Пайшлі дадому, значыць, у „Амазонку", — вабім хітрыкамі Славіка. Той



наканец здаецца і пасля піва вяртаецца нібыта дахаты.

Раніцай, калі іду на аўтобус, па вуліцы лезуць дзве раскірэчаныя постаці. Гэта Славік і Шурка. Каб не мінуцца са мной, хаваюцца на чужы панадворак.

А ў „Амазонцы" выседжвае ўжо чырванашчокі Цімох С.

— Ой, якая гожая кабетка! — усміхаецца ў мой бок дзядзька падобны на акцёра Яна Кабушэўскага. З яго кішэні тырчыць шакалад „Мілька".

Я таксама ўсміхаюся, — як добры дурань, маю нарэшце шчасце пагаварыць з маім галоўным героем.

Ева Сцепанюк
Графіка Міраслава Здрайкоўскага
(імёны герояў зменены)

Ольштынская статыстыка

Паводле пазалеташняга перапісу насельніцтва ў Вармінска-Мазурскім ваяводстве пражывала 1 428 357 асоб. З нацыянальных меншасцей найбольш у ваяводстве украінцаў — 12 009, немцаў 4 535, ромаў 435, беларусаў 274 і рускіх 219; палякамі назвалася 1 387,3 тысячы чалавек (97,1%). 22,8 тысячы (1,6%) не назвалі сваёй нацыянальнасці.

1 407,3 тыс. (98,5%) жыхароў ваяводства маюць польскае грамадзянства, 1,2 тыс. (0,1%) маюць няпольскае грамадзянства, а ў 19,8 тыс. (1,4%) грамадзянства не ўстаноўлена. Амаль 12 тысяч жыхароў ваяводства маюць падвойнае грамадзянства, найбольш (5,4 тыс.) — нямецкае; амерыканцаў у ваяводстве 0,9 тыс., канадцаў 0,5 тыс. і італьянцаў 0,2 тысячы асоб.

99,9% асоб польскай нацыянальнасці мае польскае грамадзянства, у асоб іншай чым польская нацыянальнасць польскіх грамадзян 95,6%.

98,3% жыхароў Вармінска-Мазурскага ваяводства карыстаецца ў дамашніх кантактах польскай мовай, а выключна польскай мовай карыстаецца 96,9% асоб. Мовай іншай чым польская ў дамашніх кантактах карыстаецца 1,5% насельніцтва і з гэтага ліку большасць карыстаецца таксама і польскай мовай. Выключна адной няпольскай мовай карыстаецца 20,9 тыс. чалавек, а дзвюма няпольскімі — 0,5 тысячы. Для 22,7 тысяч (1,6%) мова дамашняга карыстання не ўстаноўлена. Па-за польскай мовай найчасцей ужываюцца ўкраінская, нямецкая і англійская, крыху — беларуская.

Андрэй Гаўрылюк

(на аснове паведамлення ўпаўнаважанага Вармінска-Мазурскага ваяводы па справах нацыянальных і этнічных меншасцей Марка Лейка)

Вырашалі

У Чаромхаўскай гміне, у шасці салэцтвах няма водаправода. Гэта вёскі з прыгранічнай паласы: Баброўка, Зубачы, Янцэвічы, Беразышчы, Апака і Пагулянка. Мінулагодняя засуха паўплывала на тое, што узровень вады ў грунце панізіўся. У многіх гаспадароў у Апацы не стала ў калодзежах вады.

— Як на Сіпурцы застаўкі былі, дык вада ў рачулцы збіралася, — тлумачыць Славік Ляшук. — Тады ўзровень вады і ў калодзежах падымаўся. Але асобень, паша якога з рэчкай мяжуе, застаўкі здымаў, быццам бы яму поле залівала.

У Тапарках жыхар Варшавы вярціў артэзіянскія калодзежы. Жыхарам Апакі ідэя спадабалася. Запрасілі будаўніка да сябе. Як гаварыў солтыс Аляксей Ваўранюк, у Апацы ўжо каля дзесяці калодзежаў выкапалі. За прыкладам апачукоў і жыхары суседняй Пагулянкі пайшлі. Там амаль кожны селянін ахвотны быў на артэзіянскую студню. Кошт інвестыцыі абыходзіцца сялянам у 1 500-2 000 зл. (у залежнасці ад глыбіні калодзежа). Ці Чаромхаўская гміна фінансава падтрымае земляробаў, яшчэ невядома. Усё будзе залежыць ад сёлетняга бюджэту і радных. Сяляне пакуль што пішуць заявы ў гміну. Але самае асноўнае, што вырашалі праблему вады ў сваіх сядзібах. **(ус)**

Зарастае наша Бацькаўшчына

„Ніва": — ***Як у Крынкаўскім надлясніцтве адбываецца замена сельскагаспадарчых угоддзяў у лясныя?***

Аляксандр ЛІЦКЕВІЧ, намеснік надляснічага: — Наша надлясніцтва адноўлена ў 1992 годзе. Яно існавала да 1972 года самастойна, але наступныя дваццаць гадоў было падпарадкавана Надлясніцтву Валілы. У 1992 годзе мы пачыналі з 11 560 гектараў і з таго часу ад Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці казны мы перанялі звыш трох тысяч гектараў і ўзбуйнілі нашу плошчу на 21% — да 14 614 га. Ахопліваем тэрыторыю Крынкаўскай і Шудзялаўскай гмін, між каторыя нашы лясы падзелены амаль пароўну. За час дванаццаці гадоў мы аблясілі 2 957 гектараў. У першую чаргу праводзілі аблясенні палёў каля Крушынян і Ласінян, а пасля каля Кнышэвіч, Гарчакоў, Сухініч, Войнаўцаў, Уснара і Гаркавіч. У 1992 годзе аблясілі мы каля ста гектараў, а ў 1996-2000 гг. — па звыш трохсот гектараў штогоду. У маштабе краіны хочам давесці аблясенне да 30% яе плошчы. На тэрыторыі нашых дзвюх гмін у распараджэнні АСМК сёння каля дзвюх тысяч гектараў угоддзяў, але ў мінулым годзе атрымалі мы толькі дзевяць гектараў; агенцтва ахвотна прадае зямлю прыватнікам.

— ***Якая карысць ад аблясення?***

— Выпраўляем эстэтыку прасторы гэтай тэрыторыі, добраўпарадкоўваем аблагі, глебы пятага і шостага класаў. Калі тут існаваў пэгэээр, ён гаспадарыў на лепшых землях, а на горшых не вялася сельскагаспадарчая дзейнасць. Дарэчы, найбольш аблясенняў у Польшчы праводзіцца на пасляпэгэээраўскіх грунтах, на поўначы і ўсходзе краіны.

На нашай тэрыторыі з'явіўся цецярук. Каля Крушынян мы заклалі семнаццацігектарны вадаём, каля якога селіцца белы арол, які выконвае важную санітарную ролю. Маем звыш дваццаці малых вадаёмаў.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Лес гэта таксама „зялёныя лёгкія", якія ачышчаюць паветра. Дае ён і заробак мясцоваму насельніцтву — на нашай тэрыторыі працуе восем прадпрыемстваў лясных паслуг.

Было шмат грызуноў, пасля лісоў і драпежных птушак. Цяпер іх месца займаюць алені, сарны, дзікі, паяўляюцца ваўкі. **Шкоды ад звярыны невялікія, бо сельская гаспадарка на практыцы перастала тут функцыяніраваць**.

— ***Як складваецца вам сужыццё з насельніцтвам — ці бывае браканьерства або пакражы драўніны, — а як з мясцовымі ўладамі?***

— З мясцовым самакіраваннем — так у адной і другой гміне — супрацоўніцтва складваецца выдатна. Для прыкладу, цяпер расчышчаем мясцовыя дарогі ад снегу. Стараемся прымаць удзел ва ўсіх грамадскіх мерапрыемствах, дапамагаем у экалагічнай адукацыі дзяцей. А адмоўных з'яў няма каму здзяйсняць — па вёсках асталіся нямногія ды нямоглыя ўжо людзі.

— ***Ваша надлясніцтва прылягае да дзяржаўнай мяжы. Ці супрацоўнічаеце з беларускімі леснікамі.***

— З беларускага боку на нашым адрэзку няма лясных масіваў, з тамашнімі лясамі не мяжуем і няма патрэбы такога супрацоўніцтва.

— ***Польшча далучаецца да Еўрасаюза. Якія паслядоўнасці для нашых лясоў прынясе гэтая падзея?***

— Далучэнне да ЕС не паўплывае на нашу працу. Не прадбачваюцца ніякія абмежаванні. Маем сертыфікаты на драўніну і вялікія магчымасці яе экспарту.

— ***Якія прыродныя каштоўнасці захаваліся на вашай тэрыторыі?***

— У Пешчаной Гары ёсць запаведнік першабытнай Кнышынскай пушчы. На рацэ Нетупе маем запаведнік з разводам баброў і маляўнічымі краявідамі. На Жылічах стаіць ліпавая алея, на ўсёй тэрыторыі налічваецца звыш дзесятка помнікаў прыроды. Праз нашы лясы пралягаюць Татарскі і Напалеонаўскі шляхі.

Калі атрымаем дапаможныя сродкі, пракладзем яшчэ новыя веласіпедныя і пешыя маршруты, конныя дарожкі, лыжныя трасы, закладзем дэндралагічны сад.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр Вярбіцкі

Патрэбны паветы?

У канцы студзеня давялося мне слухаць па Беластоцкім радыё радыёперадачу п.з. „Powiaty na straty" рэд. Станіслава Пазнанскага. Ён даказваў, што калі паветы са свайго даходу высылаюць грошы ў Варшаву, дык назад атрымліваюць на 80 працэнтаў менш грошай, г.зн., што калі ў цэнтральны бюджэт дадуць 1 000 зл. то назад атрымаюць 200 зл., а 800 зл. „праесць" цэнтральны бюджэт.

Калі арганізавалі паветы дык многа гаварылася аб тым, што ўлада будзе бліжэй грамадзяніна, а атрымалася ўсё наадварот. Паветы забралі з гмін гэадэзічныя справы, рэгістрацыю аўтамашын, вадзіцельскія правы ды дазвол выдаваць пасведчанні для сялян, што маюць уласны лес. На маю думку паветы непатрэбныя, яны толькі з'ядаюць грошы падаткаплацельшчыкаў. Усё тое трэба вярнуць у гміны і без большай колькасці працаўнікоў управы гмін усё зробяць і людзі будуць задаволены. Таксама ў ваяводствах паўстала падвойная ўлада, якая праядае ў год мільярды злотаў з дзяржаўнага бюджэту — гэта Ваяводская і Маршалкоўская ўправы. І тут, на маю думку, Маршалкоўскую ўправу трэба ліквідаваць як найхутчэй, а гэта будзе намнога лягчэй для дзяржаўнага бюджэту.

Мікалай Лук'янюк

Кропкі над „і"

Кім быў Шапэн — палякам, французам? Палякі лічылі яго сваім. Французы таксама. Сварка па гэтай прычыне не ўзнікла. А кім лічыў сябе сам Шапэн? Здаецца, музыкантам. І ўсё тут ясна.

У сям'і Іваноўскіх завяліся аж тры нацыі. Адзін брат палічыў сябе летувісам. І ягонае пакаленне асталося летувісамі. Другія — палякамі быць вырашылі. Вацлава лёс, за прысвячэнне жыцця беларускай справе, скончыўся трагічна. Быў такі час тады. А ў родзе Іваноўскіх усё лічылася нармальным.

Таксама Адам Міцкевіч. Ганарыўся краінай свайго паходжання. А вось там, дзе выступае карысталюбства, пракрадаецца інтрыга — адносіны ўскладняюцца, або ўвогуле зацямняюць вобраз сапраўднасці.

Напрыклад, у Нямеччыне Эрыка стэйнбах намагаецца сарганізаваць Цэнтр выгнаных Übermenschaў, быццам пакрыўдзілі іх народы, якія не дазволілі гітлераўскім ватагам растаптаць Еўропу. І калі б сапраўдныя пакрыўджаныя не аказалі звышлюдзям супраціву і не даказалі на чыім баку віна за вайну ды ў чым яна заключаецца, можна б спадзявацца, што яшчэ паўстагоддзя, а новыя пакаленні сапраўдных пакрыўджаных, былі б гатовы паверыць нацысцкім выдумкам пра адказнасць свету за II сусветную вайну.

Зрэшты, схільнасць дзяржаў да пашырання сваіх межаў, або ўплыву на суседзяў, з'ява не новая. Немцы, Аўстрыя і Расія дзялілі Польшчу і зараз жа пачалася германізацыя і русіфікацыя польскага насельніцтва. Пасля адраджэння (і пасля I і II вайны) Польшчы палякі неадкладна ўзяліся паланізаваць усіх — каб мець народ аднародны. Паланізацыя, скажам, задума дзяржаўная. А вось як да яе ставяцца пасобныя грамадзяне? Мы ж перад уваходам у Еўрасаюз? Цяпер хто каго здаміную? Пакуль што палякі не супраць паланізацыі. Вось маленькі прыклад.

На пераломе тыдня (24-26 студзеня г.г.) Радыё Свабода перадавала ўспамін пра Чэслава Немэна-Выджыцкага. Гаварылі пра яго цёпла, называючы вялікшым польскім песняром апошняга часу. Параўноўвалі з Мулявіным. Гаварылі, з якім захапленнем слухалі яго ў Васілішках і ва ўсёй Беларусі. Прыгадалі, што быў родам з зямлі беларускай...

Ноччу з аўторка на сераду (27-28.I) пасля поўначы, пра Немэна перадавала I праграма Польскага радыё. Гучалі ягоныя песні, падаваліся вытрымкі з яго біяграфіі. Прафесійны голас вядучага звяртаў увагу на польскае паходжанне сям'і Выджыцкіх, на іх патрыятызм, на некаторыя факты з жыцця (напр. Чэслаў наведваючы Васілішкі фільмаваў сваю хату, наваколле, а потым усё гэта знішчыў — не сказана чаму). Гаварыў, што людзі ў Беларусі зацікаўленыя песнямі Немэна і што нават хваляцца яго паходжаннем з Беларусі. Вядучы праграму такія „ілюзіі" пракаментаваў у заключэнні: „Немэн нарадзіўся ў Польшчы, бо да 1939 г. там была Польшча". Вось і польская ***кропка над „і"***.

Па-мойму, да якой нацыі Немэн належыць, гэта ягоны выбар. Каму належыць зямля, на якой ён нарадзіўся, запісана ў гісторыі. А кропку над „і" я паставіў бы ў іншым месцы тэксту — перш прыгадаю, што на зямлі беларускай палякі бывалі таксама акупантамі. Гісторыю не толькі трэба ведаць, трэба яе разумець па-чалавечаму. Людзі акупацыю — як і вайну — лічаць з'явай ганебнай. А вось калі ім самім прыходзіцца быць акупантамі — ганарацца. Дзіўная такая мараль, быццам хрысціянская...

Анатоль Маўчун

З думкай аб будучыні

У Ставішчах ліквідавалі пункт скупкі малака. Прычына — нерэнтабельнасць. Аплаціць працаўніка на паўстаўкі, электраэнергію, ваду, падатак ад маёмасці ў гміну, аказаліся здзелкай без выручкі. Таму гайнаўскіх чыноўнікаў не цікавіў далейшы лёс будынка. Лепш аддаць маёмасць „пад малаток". Гайнаўскі малочны кааператыў прапанаваў арганізаваць пункт скупкі ў прыватнай кватэры. Абавязаўся абяспечыць яго ў рэзервуар для прыёму малака (бясплатна — кошт 3 000 зл.).

Марыя Саўчук з Чаромхі, што жыве па вуліцы Ланковай, лічылася асноўным пастаўшчыком у Ставішчах. Ліквідаванне „злеўні" гэта затрата прыбытку 1 200-1 500 зл. у месяц.

— Мелі мы чатыры дойныя каровы, — канстатавала ў размове Марыя Саўчук. — Малако пастаўлялі „экстра". Гэта давала месячны прыбытак другой мужавай зарплаты. Маем трое жанатых дзетак. Кожнаму трэба неяк у жыцці дапамагчы. З адной зарплаты цяжка прыйшлося б выжыць. Таму вырашылі арганізаваць пункт скупкі ў сябе на сядзібе. Правялі дзеля гэтага неабходны рамонт. Рэзервуар для малака прызначыў Гайнаўскі малочны кааператыў. І так Марыя пачала працаваць скупшчыцай.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Марыя Саўчук у час працы

— Паколькі адна карова перад выцяленнем, дык купілі дойную карову, — працягвае мая субяседніца. Зараз статак налічвае пяць кароў. Пашы маем удосталь. Склалі заяву ў Гайнаўскае аддзяленне Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі на гадавы ліміт малака.

— Які прыбытак, апрача пастаўкі малака, маеце з таго, што вядзеце пункт скупкі?

— Паводле дагавору з пастаўшчыкамі, кожны селянін у месяц плаціць па восем грошаў ад літра малака. Напрыклад, калі хтосьці паставіў 400 літраў, дык плаціць 32 зл.

— Колькі скупляеце малака?

— 400-450 літраў у дзень, прытым мы самі пастаўляем палову гэтай колькасці. Апошнюю пастаўляюць 13 пастаўшчыкоў са Ставішчаў. — Раней забіралі малако штодзённа. У снежні мінулага года прыязджалі праз дзень, — завяршае размову жанчына.

Варта адзначыць, што Марыя Саўчук з'яўляецца чытачом „Нівы". Штогод купляе „Ніву" з календаром. Сёлета папрасіла ў мяне дзесяць экземпляраў. „Разыдуцца", — гаварыла. Каб больш такіх сімпатыкаў мела „Ніва".

Уладзімір Сідарук

Месца для адпачынку

„Купала" Ірыны і Зіновія Галёнкаў у Арэшкаве-Парыеве распаложанае на ўскраіне жывапіснай Белавежскай пушчы. Гэта казачнае месца для адпачынку на ўлонні прыроды. Аматары жывёл узрадуюцца непасрэдным кантактам з фаунай у міні-заапарку (хатнія птушкі, фазаны, страусы, коні, тарпаны, срэбныя лісы).

Гаспадарка дзейнічае некалькі гадоў і хаця яна, як кажуць уладальнікі, нерэнтабельная, далей будзе служыць турыстам. На ўтрыманне гаспадаркі выкарыстоўваюцца даходы з арэшкаўскага філіяла варшаўскай фірмы „Зэгір".

— Што памянялася ў гаспадарцы за апошні час? — пытаю Зіновія Галёнку.

— Летам нашу гаспадарку наведала каля 1 500 дзяцей — вучняў малодшых класаў і дашкольнікаў. Сарганізавалі мы інтэграцыйны фэст, на які прыехала ўся школа з Новага Корніна — дзеці, настаўнікі і бацькі. Адбываюцца ў нас цыклічныя мерапрыемствы — Купалінка, Агляд гармонікаў, Агратурыстычны чэмпіянат свету па кіданні кавальскімі абцугамі.

Узнікла патрэба пабудовы памяшкання для гасцей і тады паставілі мы беларускую хатку, у якой у якасці экспанатаў трымаем, між іншым, старыя прылады і абсталяванне. Адкрыццё хаткі адбылося 13 студзеня, а на праваслаўны Новы год прымалі мы гасцей з Ольштына, Варшавы і Гайнаўкі. Падчас адкрыцця перарэзвалася не стужка, але пярэвясла, і не ножніцамі, толькі сярпом. Хатку назвалі мы „Карчмой пад чорным бараном", а над дзвярыма павесілі мы барановы рогі (чорны баран — галоўны прыз чэмпіянату па кіданні абцугамі).

Чакаем гасцей, а тых зімою малавата. Людзі хочуць ездзіць на санях, але ў нас асфальтавыя чорныя дарогі, таму адсылаем іх у Лазіцы. Турыстам прапануем правядзенне часу ля вогнішча. Могуць яны пакарыстацца дзвюма вянджарнямі (за раз можна вэндзіць аднаго дзіка, або два бараны, або 500 порцый каўбасы). Аматарам страляння прапануем лукі і пнеўматычную зброю. Можна пакатацца на водных веласіпедах, а за 18 злотых — карысна правесці час і паабедаць.

— Фірма „Зэгір" развіваецца, — гаворыць Зіновій Галёнка. — Вясною прыму на працу новых рабочых. Прыйшлі заказы з многіх краін, найбольш з Англіі, дзякуючы рэкламе ў Інтэрнэце (www.zegir.com.pl). Будзе з чаго фінансаваць „Купалу".

Зіновій Галёнка марыць таксама аб адкрыцці ў Гайнаўцы таннай сталовай.

— Рэстаранаў у Гайнаўцы многа, але няма танных сталовых, якімі маглі б карыстацца маламаёмныя людзі. Бедных людзей цяпер многа і я мог бы варыць ім суп па 1,50 зл. за порцыю. Аднак на гэта патрэбнае таннае памяшканне.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Аздобай „Купалы" з'яўляюцца тарпаны — тры жарабцы і кляча. Былі яны куплены ў Белавежскім нацыянальным парку.

Міхал Мінцэвіч

Актыўнае жыццё

Размова з Мікалаем ЧЫКВІНЫМ — старшынёю Праўлення Раённага аддзела Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў у Гайнаўцы.

— Якія традыцыі ў Вашай арганізацыі?

— Польскі саюз пенсіянераў і інвалідаў узнік у 1970-х гадах і першапачаткова фінансаваўся дзяржавай. Пры „Салідарнасці" фінансаванне з дзяржбюджэту было адменена і мы, як няўрадавая арганізацыя, дзейнічаем за кошт членскіх узносаў і спонсарскіх ахвяраванняў. Гайнаўскае аддзяленне налічвае больш за 700 членаў згуртаваных у пяці гмінных гуртках: Белавежа, Дубічы-Царкоўныя, Кляшчэлі, Нарва і Чыжы (арганізацыі ў Нараўцы і Чаромсе вядуць самастойную дзейнасць).

— Чым займалася Ваша арганізацыя ў мінулым годзе?

— Наша арганізацыя, якая гуртуе перш за ўсё былых работнікаў асветы, аховы здароўя, тартака, чыгункі, лясніцтваў, сваю дзейнасць накіравала на інтэграцыю пенсіянерскага асяроддзя. Гэтаму садзейнічалі ладжаныя намі мерапрыемствы: экскурсіі (айчынныя і замежныя), святочныя сустрэчы, фэсты, вечарыны. Абменьваемся таксама вопытам з ветэранскай арганізацыяй з Пружан, пры якой працуе харавы калектыў з аркестрам „Чырвоная гваздзіка" з сарака чалавек. Клапоцімся пра ўмовы жыцця нашых членаў, дапамагаем маламаёмным. Адзінокія маюць нагоду знайсці сабе пару на нашых мерапрыемствах.

— Хто дапамагае Вам у штодзённай дзейнасці?

— Нашы члены вядуць вельмі актыўнае жыццё і па меры сваіх магчымасцей уключаюцца ў бягучую дзейнасць арганізацыі. Найбольш актыўныя — члены прэзідыума Праўлення: скарбнік Тарэса Чарнецкая, якая працуе на гэтай пасадзе з 1998 г.; намеснік старшыні Валянціна Гацлоўская і заадно старшыня сацыяльна-бытавой камісіі; сакратар Эдуард Бай і мая правая рука Аляксей Дзмітрук. У гмінных гуртках самымі актыўнымі дзеячамі з'яўляюцца Якуб Шышкевіч з Чыжоў, Барбара Шымчак з Кляшчэль, Галіна Ціханчук з Белавежы, Галена Бучкоўская з Дубіч і Марыя Хіліманюк з Нарвы.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Віктар Бура

Вачыма паляка

Лёгкае „пераборшчванне"

Я ўсё больш расчараваны амерыканскай палітыкай. Не без прычыны тут, пэўна, сапраўдная паводка інфармацыі, якая сплывае на мяне галоўным чынам з польскіх радыё і тэлебачання. Сорам звязаны са звышнадзейнасцю польскага ўрада ў адносінах да новага Вялікага брата прыкрываецца сродкамі масавай інфармацыі паведамленнямі а то аб меншых, а то аб большых скрыгатах Белага дома. Зразумела, я разумею, што ў ЗША сур'ёзная праблема: тэрарызм. Але мае яе і Расія, а ў Заходняй Еўропе — Нямеччына ці Францыя (традыцыйныя цэнтры тэрарыстычных арганізацый), ужо не ўспомню аб Ізраілі, які, бывае, прымяняе не лепшыя метады ў барацьбе з праціўнікамі.

Ашарашыла мяне інфармацыя, здавалася б, зусім іншага сорту. Вось агенты Белага дома не дазволілі прыбыць у ЗША кубінскаму ансамблю „Buena Vista Social Club" („Свецкі клуб «Буэна Віста»"), які атрымаў намінацыю да адной з найважнейшых у свеце музычных прэмій — Грамі. Чаму? Таму, што яго аплачвае кубінская камуністычная партыя, а дырэктыва прэзідэнта ЗША — аж дзіў, ад 1985 года — забараняе ўезд такім асобам ці групам асоб. Што цікавае, некаторыя з членаў гурту бывалі ўжо ў Штатах, а ягоны вакаліст ужо тры разы здабыў Грамі. Якасьці ніхто не ўспамінаў аб дырэктыве з канца халоднаваеннага часу. Пішу гэты тэкст пару дзён да ўрачыстасці ўручэння гэтых узнагарод. На гэты момант, на нішто не здаліся амерыканскія і сусветныя выказванні, што музыкуючыя кубінцы — знакамітыя, заваявалі густы слухачоў амаль на ўсіх кантынентах, таксама — а можа перш за ўсё ў краіне прэзідэнта Джорджа В. Буша.

— Музыка — універсальная мова, — прабаваў тлумачыць піяніст ансамбля „Buena Vista Social Club".

— Гэта перадвыбарчы паклон Буша кубінскай мафіі на Майамі, — грымелі незадаволеныя амерыканскія фанаты гурту.

ЗША бачацца як прыклад краіны, якая захоўвае правы чалавека, дэмакратычныя прынцыпы, справядлівасці, свабоды выказвання і сумлення. Гэтая адносна маладая дзяржава даходзіла да гэтых каштоўнасцей не без болю, спазнаючы расізм і неталерантнасць. Аднак у адносінах да кубінскіх музыкаў Белы дом забыўся, здаецца, аб здаровым розуме і памяркоўнасці, нават калі якімсьці апраўданнем меў бы быць рэжым уведзены ў адносінах да грамадзян г.зв. восі зла. А, можа, звычайна прэзідэнт Буш не цалкам уражлівы музычна, як ягоны папярэднік Біл Клінтан (саксафаніст-аматар) і можа ўсё мае ён праблемы з вядзеннем замежнай палітыкі з клятым невуцтвам наконт геаграфіі ў фоне.

У той самы час, калі ў ЗША паслужыліся ў адносінах да кубінскіх музыкаў дырэктывай ад 1985 г., шчэцінскі суд у Польшчы выдаў прыгавор на тры гады турэмнага зняволення на галоўнага рэдактара „Wiadomości Polickich" за тое, што не перапрасіў ён тэрмінова аднаго з мясцовых чыноўнікаў — як гэта акрэсліў суд — за яго абнаслаўленні ў публікаваных у часопісе артыкулах. Нейкі дзеяч Рады этыкі медыяў у тэлебачанні параўнаў гэта да беларускіх практык. Мала гэта адпаведнае, калі гаварыць далікатна. На Беларусі ніхто не слухае і не чакае ад журналістаў доказаў ці аргументацыі ў публікацыях ці пазней перад судом на апраўданне крытычных тэзісаў.

Не магу ацэньваць прыгавор шчэцінскага суда на ўзроўні віны і пакарання, паколькі не ведаю спрэчных артыкулаў і дэталяў спраў, якія яны кранаюць. Ведаю, аднак, адно, што не мецілі яны ў бяспеку дзяржавы, не пагражалі бяспецы ці здароўю грамадзян і гд. Пакаранне турмой за абнаслаўленне і брак перапросін за прэсавыя артыкулы аднолькавы кур'ёз, як і прымяненне забароны амерыканскім урадам уезду кубінцам-музыкантам. Як ужо сказаў наконт рашэння шчэцінскага суда польскі омбудсмен (rzecznik spraw obywatelskich), у абодвух выпадках гэта „lekka przesada".

Мацей Халадоўскі

Зорка
старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паэткі з Нарвы

Цікавая з'ява — Нараўка і Нарва апынуліся сярод першых школ, якія ўдзельнічалі ў VIII Агульнапольскім літаратурным конкурсе беларускай паэзіі і прозы.

Сёння друкуем верш Ані Іванюк, гімназісткі з Нарвы. Аня здаўна піша ў „Зорку", як і сяброўкі — Аня Садоўская (на здымку першая злева) і Ася Стоцкая (трэцяя).

Да конкурсу прыступілі яшчэ Эвеліна Прабуцкая і Марта Капчук. Апошняя — ужо вучаніца Белліцэя ў Бельску-Падляшскім. Аня Садоўская — студэнтка беларусістыкі ў Беластоку. Усе дзяўчаты — выхаванкі **Ніны Абрамюк**, настаўніцы беларускай мовы Пачатковай школы ў Нарве.

Зорка

Вершы Віктара Шведа

Празмерная цана

Аглядае вучаніца Ленка
У магазіне стройныя сукенкі.
— Пасля пэўных пераробак
Зрабіла б я пакупкі спробу.

Спытала Ленку прадаўшчыца
Пра пераробак таямніцу.
Адказвае на гэта Ленка:
— Празмерная цана сукенкі.

Морква, сынок, папраўляе зрок

Матулю раніцай пытае
Дапытлівы сынок:
— Ці праўда што нам морква мае
Карысны ўплыў на зрок?

— Каб елі моркву дзеці, мару,
Павінен быць прымус.
Хто ж бачыў каб у акулярах
Хадзіў хоць адзін трус.

Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Сябры?

Людзі сябруюць.
Яны разам смяюцца,
гуляюць, танцуюць.
У няшчасці
адзін аднаго суцяшае.
Толькі чаму
ў глыбіні душы
яны цешацца
з благіх клопатаў
свайго прыяцеля?
Можа гэта не сябры,
а замаскаваныя ворагі,
якім сэнс жыцця
надаюць праблемы
іншых людзей?

Аня Іванюк, Гімназія ў Нарве

Замкі Беларусі

Замак у Смалянах — або Белы Ковель, — як часта завуць гэтую крэпасць, знаходзіцца на ўсходзе Беларусі непадалёк Оршы.

— Чаму Белы Ковель?

— На працягу некалькіх стагоддзяў замак быў памаляваны ў белы колер. Сёння ацалеў адно фрагмент замка з чырвонай цэглы, аднак уважлівы глядач прыкмеціць сляды даўняга белага колеру. У сярэдзіне жылыя залы былі размаляваны фрэскамі, аздоблены скляпяністымі перакрыццямі і камінамі.

Сярод уласнікаў замка былі княжацкія роды Ковеляў і Сангушкаў. Замак пабудаваны ў пачатку XVII стагоддзя ў рэнесансавым стылі. Узведзены на невысокім насыпе сярод дрыгвы, аколены рачулкай Дзярноўкай. Канчаткова зруйнаваны ў другой палове XIX стагоддзя. Сёння захаваўся адно фрагмент корпуса і вежа, на якой віднее сямейны герб уладальнікаў.

Нягледзячы на заняпад замка, тут добрае месца для правядзення рыцарскіх турніраў і мастацкіх пленэраў. Месца натхніла Уладзіміра Караткевіча, дзякуючы чаму рэха тутэйшай гісторыі адчуваем у яго раманах. Караткевіч паказаў Смаляны ў часы росквіту. Замак на мяжы Вялікага княства Літоўскага і Маскоўі быў цікавы не толькі мясцовым. Сюды ў пошуках экзотыкі і славы прыязджалі служыць рыцары з Заходняй Еўропы.

Зорка

Конкурс. Адкажыце на пытанне: Чаму замак у Смалянах называем „Белым Ковелем"?

Адказ на конкурс „Замкі Беларусі" ў „Зорцы" № 5: Самым вядомым прадстаўніком княжацкага роду Сапегаў быў канцлер Вялікага княства Літоўскага ЛЕЎ САПЕГА.

Кніжныя ўзнагароды выйгралі **Паўліна Чурак**, **Наталля Каўшук** і **Аня Раманюк**. Віншуем!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Расліны маёй ваколіцы

Дваццаць восем асоб увайшло ў біялагічны кабінет. Усе селі за парты. У канцы залы я ўбачыла шафкі, на якіх размяшчалася выстаўка па анатоміі чалавечых клетак. Клеткі гэтыя былі зробленыя з пластыліну, паперы, а нават... кубікаў! Над выстаўкай прэзентаваліся шкілеты звяроў і птушак. Іншыя назіралі за акварыумам, у якім плавалі рознаколерныя рыбы. Мой сябар Адам нават хацеў злавіць адну, але ў той жа момант увайшла настаўніца...

Тэмай урока была расліннасць нашай ваколіцы. Наша настаўніца, Аліна Пліс, запрапанавала нам паглядзець фільм аб кветках.

Я далей разглядала кабінет. У куце заўважыла ракавіну і зялёны кош. Вокны зацягнуты былі ралетамі, а на падаконніках стаялі кветкі.

Мне не хацелася пакідаць зялёны кабінет. Настаўніца знікла за дзвярыма, якіх раней я не заўважыла — іхнюю таямніцу я пастанавіла зведаць на наступным уроку.

Марта Кузьма, III „а" кл. Белгімназіі ў Гайнаўцы

Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Мая сястрычка

У нядзелю ўстаў я рана. Аказалася, што няма мамы. Я запытаў у бацькі.

— Мама ў бальніцы. Пасля абеду даведаюся, ці нарадзіла ўжо.

— Мама не памрэ? — са страхам спытаў я, бо чуў, што жанчыны пры родах паміраюць.

— Не, — адказаў бацька, — цяпер жанчыны не паміраюць.

Пасля абеду мы з братам з нецярпеннем чакалі бацькі.

— Нарадзілася сястрычка, — паведаміў нас бацька.

— Чаму не брат?

— То ж вас чатырох хлопцаў, няхай адна дзяўчынка будзе.

— Добра, што дзяўчынка, але няхай ужо былі б усе хлопцы.

На другі дзень пайшлі мы з бацькам у бальніцу наведаць маму і маленькую сястрычку. Мама ляжала ў пасцелі, а побач яе, ахутаная ў пялёнкі ажно пад шыю маленькая дзяўчынка. Мама карміла яе грудзьмі. Я далікатна дакрануўся да яе галоўкі.

— Мама, я таксама быў такі маленькі?

— Так, — з павагай адказала мама, — усе мы нараджаемся маленькімі. Пасля мамы нас гадуюць і вырастаем на вялікіх.

Спадабалася мне сястрычка. З нецярпеннем чакаў я, калі яна і мама з'явяцца ў хаце.

Калі мама і сястрычка выйшлі з бальніцы дома, я падыходзіў і размаўляў з малою. Часта браў яе на рукі ды калыхаў. Усе мы гаварылі да яе, а ў чацвёртым тыдні жыцця яна пачала да нас усміхацца і гаварыць гу-гі-э. Але калі злуецца, тады кажа цвёрда — гы-гы-гы.

Я вельмі люблю сястрычку і хачу, каб яна хутчэй стала на ногі ды пачала гаварыць. Цешуся, што яна расце і з кожным днём — становіцца цяжэйшай. Рана цалую яе на прывітанне, а вечарам — на дабранач. Хачу, каб была яна здаровай і шчаслівай. Яна цяпер у нас найважнейшая, расце і нельга яе даводзіць да плачу. Трэба яе карміць — тады, калі яна хоча і колькі хоча. Трэба ёй дагаджаць, як царыцы.

Адам Юрчук, Гайнаўка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Сцэнка з пастаноўкі „Хрысціны" ў беларуска-польскім садку ў Беластоку

Белы пух

Гэтага дня звечара апусцілася на зямлю белая плахта пуху. Зімовая плахта снегу блішчэла ў святле залатых зорак. Неўзабаве з-за небасхілу выглянула чырвонае сонца, у якім заззялі ўсялякія мастацкія ўзоры на вокнах. На панадворку можна было пачуць дзіцячыя галасы. Дзеці гулялі на снезе. Калі сонца схавалася, на двары стала холадна і непрыемна. Дзеці перапалохаліся марознага ветру і ўцяклі дахаты. Шэрыя хмары закрылі сонца, пачаў сыпацца снег. На панадворку пахаладзела. Вецер сумна дабіваўся ў хату.

Марта Бяглюк, III „б" кл.
Гімназіі ў Гайнаўцы

Мамінай сцяжынай

Прыгрэла зімовае сонейка і адразу весялей стала і людзям, і звярам ды птушкам, і ўсёй прыродзе. Іскрыўся снег, паветра аж звінела. Алінка весела пазірала з-пад свае цёплае шапкі на ўсе зімовыя прыгоствы: у такі час хочацца, каб зіма не мінала. Найгорш, калі мароз такі, што, здаецца, нос табе адпадзе — так ён шчыпае ды кусае, і вятрыска дзьме, колкімі мурашкамі залазіць табе пад паліто, у рукавіцы. Алінчына мама кажа:

— Вось, пахадзіла б ты ў школу як я — туды і назад разам шэсць кіламетраў, і не па расчышчаным асфальце, а па гурбах табе па пашкі! У валёначках з чорнымі галошамі, якія пасля можна было скінуць у школе, каб па калідорах ціха хадзіць (бо як жа пабяжыш — досыць коўзка!) у саміх валёнках, хто ў шэрых — з воўны шэрых авечак, хто ў чорных — з чорных. У нашай школе не было тады батарэяў, а стаялі печкі, якія дзядзька Антон распальваў яшчэ на досвітку, каб нагрэліся, пакуль прыйдзем на ўрокі. А мы на перапынку, замест бегаць па калідорах, пастаем спінамі да кафляў, грэем далоні. Глядзіш, а яны чырвоныя робяцца: ад марозу.

— Гэта не той час, — кажа Алінка. — Цяпер, пакуль заеду ў гмінную школу, нават не змерзну. А ў нашай школе абагараваюць знізу, ад падлогі, уяўляеш сабе? У тапцях горача хадзіць...

— А мая школа пустуе... Будавалі яе нашы бацькі, пасля так прыгожа разбудавалі, цэнтральнае ацяпленне ўстанавілі, кухню зрабілі, каб не толькі параным малаком зімой дзеці падмацаваліся ды нагрэліся, — уздыхае мама. — А ты ніколі не забывай шапкі, глядзі, рукавічак не згубі.

Колькі там чалавеку думкі пра шапку ды рукавіцы! На перапынку выбеглі дзеці са школы, бо ж не ўседзіш у такое надвор'е. Нават не надзела шапку Алінка, не выцягнула яе з кішэні. А рукавіца выпала, невядома дзе — на падворку, ці ўжо ў гардэробе. А шалік, як сядзеў у рукавах, так і дзесьці выпаўз. Стала шукаць іх Алінка, бегаць па школе, а аўтобус з дзецьмі ўзяў дый паехаў. Шалік знайшла пад уваходнымі дзвярыма, ды не свой. Выйшла Алінка на вуліцу пад школай. Накінула капішон на галаву, ды холад усё ж шчыпае. Рукі ў кішэні запхнула, ды давялося адну выцягнуць — стала махаць рукой да праязджаючых машын, каб падвезлі дахаты. Малы „фіат" ехаў у вёску, дзе стаіць маміна школа. Дзевяць кіламетраў праехала Алінка, здавалася, вельмі хутка, але стала цямнець. Выкараскалася дзяўчынка з аўто, завязала на галаве чужы шалік, зацягнула каптур шнурочкам найцясней як магла, адну рукавічку надзела на правую руку, каб набіраць размаху, і патэпала маміным шляхам дахаты. Праз лес, побач заснежаных палеткаў. Праўда, ужо па асфальце, і не ў шэрых валёначках.

Міра Лукша

Мая школа

Я вучуся ў апошнім класе Белгімназіі ў Гайнаўцы. Мая школа — найпрыгажэйшая. Самай прыгожай яе часткай з'яўляецца спартыўная зала. Яе гаспадаром — Раман Данілюк. Апрача спартзалы ў школе мноства розных прадметных кабінетаў. Другі паверх — самы важны ў цэлым будынку, таму што там знаходзяцца настаўніцкі пакой, кабінет педагога, дзве беларускія, хімічная, матэматычная, геаграфічная і камп'ютэрная залы. Тут таксама знаходзіцца школьная крама, у якой можна набыць амаль усё. На трэцім паверсе знаходзяцца кабінеты польскай мовы, фізікі, біялогіі, нямецкай мовы і гісторыі. Кожнай залай апякуецца іншы клас. Наш — залай нумар 8. Перад школай распасціраецца школьная пляцоўка, на якой можна адпачыць у час перапынку. У школе вучаць найлепшыя настаўнікі. Беларускай мове навучае прафесар Іаланта Грыгарук, польскай — прафесар Ян Місяюк. Спадарыня Мішчук навучае нас матэматыкі. Маім класным выхавацелем з'яўляецца спадар Славамір Чыквін. Навука ў гэтай школе вельмі прыемная і я шмат чаму тут яшчэ навучуся.



Адам Галёнка,
Белгімназія ў Гайнаўцы

Польска-беларуская крыжаванка № 8

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 4: Зубр, кос, бор, Ала, вавёрка, ліса, лек, мак, ара, льгота. Зубр, алень, баравік, лёс, арамат, кот, скнара, Ас, зайка.

Узнагароды, **каляровыя алоўкі**, выйгралі: **Паўліна Чурак** з Арэшкава, **Патрыцыя Лісіцкая** з Беластока. Віншуем!

Л. Грыгарук: Каб заахвоціць да беларускай мовы, прыступаем да конкурсаў і арганізуем дадатковыя мерапрыемствы...

Залатыя рукі нашых продкаў

У Комплексе школ, распаложаным па вуліцы Новаваршаўскай у Гайнаўцы, хутка павялічваецца лік экспанатаў у „рэгіянальнай ізбе". Заснавалі яе вучні і настаўніцы Гражына Паўлючук і Людміла Грыгарук. У мінулым годзе ў памяшканнях міні-музея спаткаліся вучні I „а" класа, іх бацькі і настаўніца Гражына Паўлючук. Амаль усе дзеткі ў гэтым класе вучацца беларускай мове і таму выступілі перад бацькамі з беларускамоўным прадстаўленнем. Родзічы не толькі паслалі сваіх дзетак на ўрокі беларускай мовы, але вельмі актыўна ўключыліся ў дапамогу школе.

Рыхтуючыся да сустрэчы дзеткі прыносілі ў школу прадметы выкананыя іх бабулямі і дзядулямі. Выстаўку „Залатыя рукі нашых продкаў" папоўнілі экспанаты, у тым ліку сурвэткі, хусткі, ручнікі, посцілка, вырабы з саломы і ракіты. Побач даўніх вырабаў на выстаўцы паказваецца рукадзелле, выкананае ў недалёкім мінулым. Зараз жыхары прыпушчанскіх вёсак робяць упрыгожанні з ракіты, якія прадаюць у заходнія краіны. Раней многа асоб пляло каробкі, зараз некаторыя выконваюць саламяныя ўпрыгожанні. На пастаяннай выстаўцы ў „рэгіянальнай ізбе" знаходзяцца калаўроткі, стары ложак, драўляны куфар і вырабы з ільну і воўны.

Дзеткі, бацькі і настаўніцы актывізавалі дзейнасць, дзякуючы атрыманню сродкаў у рамках Конкурсу малых грантаў, арганізаванага Цэнтрам грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

— Лягчэй арганізаваць мерапрыемствы, калі ёсць фінансавая дапамога. Хаця сродкі атрыманыя на рэалізацыю нашага праекта невялікія ў маштабе выдаткаў школы, то вельмі дапамаглі нам. За грошы з грантаў куплялі мы матэрыялы патрэбныя для правядзення мастацкага конкурсу. Выдаткоўвалі сродкі на ўзнагароды і спатканне з бацькамі. Старэйшыя вучні разумеюць ужо, што толькі пераможцы атрымліваюць узнагароды. Усім малодшым дзеткам, якія выступаюць, трэба даваць невялічкія падарункі, — гаворыць настаўніца Гражына Паўлючук. — Цяжка было б таксама рэалізаваць праект без бацькоў першакласнікаў, якія вельмі ахвотна ўключаюцца ў дапамогу школе.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гражына Паўлючук (справа) і Людміла Грыгарук былі арганізатарамі выставак народных экспанатаў

***У Комплексе школ па вуліцы Новаваршаўскай у Гайнаўцы беларускай мове вучыцца каля 230 асоб**. Дзетак у класах I-III беларускай мове вучыць Беата Іванюк, а старэйшых вучняў з падставовай школы і гімназіі — Людміла Грыгарук. Амаль усе дзеткі з класаў I-III „а" вучацца беларускай мове. Ужо некалькі гадоў заняткі па гэтым прадмеце арганізуюцца з першага класа падставовай школы. Для старэйшых вучняў вучоба на беларускай мове наладжваецца ў міжкласных групах. Вучні, якія намерваюцца паступаць у белліцэй, толькі ў гімназіі запісваюцца на ўрокі беларускай мовы. У мінулым школьным годзе Барбара Каліноўская і Анна Грыгарук у Конкурсе беларускай гавэнды занялі II месцы. Марыёля Герман атрымала вылучэнне на цэнтральных элімінацыях дэкламатарскага конкурсу беларускай мовы „Роднае слова".*

У рамках праекта „Захаваць ад забыцця — Мая малая айчына Гайнаўка" наладжаны быў мастацкі конкурс „Мая малая айчына". Працы аддалі каля пяцідзесяці ўдзельнікаў. Некаторыя работы былі выкананыя з выкарыстаннем тканін, паперы і засушаных раслінак. Першыя месцы занялі Данель Андраюк з I „а", Паўліна Хвойка з II „а", Іаанна Юрчук з III „а" і Адрыянна Сачко з IV „ц". Усе яны вучацца беларускай мове. На выстаўцы — многа вясковых краявідаў з крыжамі і цэрквамі.

У час сустрэчы вучняў I „а" класа з бацькамі адбылося адкрыццё выстаўкі „Залатыя рукі нашых продкаў" і паказваліся мастацкія работы — плён конкурсу „Мая малая айчына". Дзеткі, якіх толькі некалькі месяцаў беларускай мове вучыць Беата Іванюк, падрыхтавалі інсцэніроўку „Восень" на беларускай мове. Вучні спявалі і дэкламавалі. Бацькі спяклі караваі, якімі частавалі сабраных.

— Каб заахвоціць да беларускай мовы, прыступаем да конкурсаў і арганізуем дадатковыя мерапрыемствы. Былі мы на турніры арганізаваным у бельскай „тройцы", два разы ездзілі на экскурсіі ў Беларусь і прымалі беларускіх вучняў. Апошнім часам прыступілі мы да праекта арганізаванага Павятовым староствам у Гайнаўцы, у якім будуць прымаць удзел вучні з Беларусі, — заяўляе настаўніца беларускай мовы Людміла Грыгарук.

Аляксей Мароз

Мая сям'я — беларускі народ

Сяджу і думаю, а словы не кладуцца на паперу. Розныя думкі ідуць у галаву. Разважаю аб самым блізкім: аб беларускім народзе. Я — маленькая часцінка гэтай вялікай сям'і і гэтым ганаруся.

На парозе новага тысячагоддзя хочацца смела глядзець у будучыню, верыць у яе светласць. Але ці магчыма гэта, калі пачынаем забываць родную бацькоўскую мову, страчваць сваю духоўнасць?

Кожны з нас павінен памятаць, што маем абавязак захаваць і пакінуць сваім нашчадкам атрыманае ад продкаў. Будучыня — гэта паслядоўнасць нашых сённяшніх спраў, учынкаў, імкненняў, жаданняў і думак. Памятайце, паважаныя сябры, што будучае пачынаецца сёння. І калі ў будучыню нельга зазірнуць, то можна паўплываць на яе сваімі ўчынкамі і справамі.

З вялікай пашанай схіляю галаву перад Кастусём Майсенем і Аляксандрам Баршчэўскім, якія сваім розумам сягнулі далёка наперад і вырашылі пабудаваць у Гайнаўцы музей беларусаў усяго свету. Пачатая імі ў 1984 г. ідэя, пры падтрымцы айчынных і замежных беларусаў, здзейснілася — музейны будынак гатовы. Сёння трэба тэрмінова вырашыць якім павінен быць музей.

Музей павінен служыць нашай бацькаўшчыне. Многія могуць спытаць: што такое бацькаўшчына? Адказ просты — гэта ўсё тое, што вакол нас, што ў нас саміх. Гэта родныя палеткі, дарогі, сцяжынкі, што вядуць да роднага парога, да магіл родных. Гэта дом, з якога выйшлі мы ў шырокі свет, а ў ім — усё знаёмае да драбніцы: лыжкі, міскі, калыска, стол на покуце пад абразамі з хлебам накрытым белым ручніком. І родная мова. Усё гэта трэба бараніць. Але ці мы гатовыя на такую справу? Ісці нам трэба смела, не аглядаючыся. Калі аглянемся, пішы прапала.

Віктар Бура

Успаміны N.N. з Чараўкоў

Вогненнае памежжа

Час актывістаў (1)

У 1940 годзе пайшоў я ў першы клас. Школа размяшчалася ў будынку плябаніі ў Кажанах, адкуль саветы выгналі бацюшку Мікалая Лебедзева; ён перасяліўся ў прыватную хату. Навучанне ў школе вялося на беларускай мове. Навучалі Мікалай Грыгарук з Чараўкоў, Серафім Матвяйчук з Панкоў і яшчэ адна маладая настаўніца з Беларусі.

Калі ў 1939 годзе насталі саветы, ніхто ў нашай вёсцы іх не вітаў. Помню толькі, што ў адзін Першамай на канцы Чараўкоў, што ад Панкоў і Дарожак, выстраілі браму і тады прамаўляў Васіль Гаўрылюк з Чараўкоў, які быў старшынёю сельсавета ў Трычоўцы. У Трычоўцы сельсавет размяшчаўся ў плябаніі. Ксяндза і яшчэ траіх католікаў — Сіца з Трычоўкі, Дамашука з Багданкаў і Кажанецкага з Росталтаў — саветы вывезлі ў Алтайскі край; пасля ўсе яны вярнуліся. За іх вывазку падпісаліся „нашы".

У Заячках быў калісь маёнтак графа Гедройца; граф пахаваны ў Юхнаўцы. Дачка Гедройца прыняла царскага палкоўніка Шрадэцкага, двараніна, і ў іх нарадзілася трое дзяцей: сыны Віця і Лема ды дачка Манюся. Шрадэцкі быў паляўнічым і гулякам, прадаваў зямлю і з так зароблены мі грашыма ехаў у Вільню або Варшаву гуляць у карты. Хаця бацька прагуляў шмат зямлі, усё ж такі кожнаму з дзяцей асталося па пяцьдзесят гектараў. Калі насталі саветы, нехта з нашых падказаў і Віцю з Лемам вывезлі; яны ўжо назад не вярнуліся: адзін пасля вайны апынуўся ў Англіі, а другі недзе прапаў. А Манюсю не вывезлі. Яна была раней жыла з нейкім немцам і ў іх нарадзіўся сын. Пасля той немец прапаў або ўцёк ад яе і яна стала жыць з мясцовым селянінам Сухаверскім. У час нямецкай акупацыі хадзілі тут савецкія псеўдапартызаны і яны ў 1943 ці 1944 годзе забілі таго Манюсінага сына. Манюся яшчэ пасля прадавала зямлю, а ездзіла яна жалезняком.

Наш сельсавет ахопліваў Чараўкі, Кажаны, Залесак, Заячкі, Панкі, Дарожкі, Трычоўку, Росталты, Баранкі і Багданкі. Апрача Гаўрылюка ў сельсавеце працавалі яшчэ Васіль Матвяйчук з Дарожак — сакратар сельсавета, Аляксей Шымчук з Кажан — спецыяліст па сельскагаспадарчых справах і Уладзімір Міранчук з Панкоў — сакратар камсамола. Гаўрылюк быў чагосьці праваліўся і пасля на яго месца назначылі Яўгенію Міранчук з Панкоў. У Чараўках існаваў і комбед, да якога належалі беззямельныя і звычайныя лодары, што не хацелі працаваць.

Саветы так мучылі людзей, што не дай Бог! Каб яшчэ год, то і не вытрывалі б. Трэба было каменне на аэрадром у Заблудаў вазіць і даваць абавязковыя пастаўкі. Збожжа людзі везлі ў Беласток, а там жыды яго па двое сутак прымалі, „ваўкоў" шукалі. Ездзілі таксама ў Жэдню лес сячы. Каля нас лесу не было, людзі не ўмелі ў гэтых умовах працаваць, мучыліся. І не ўспее такі прыехаць, калі яго запыняў хто з комбеда: „Не выполнил плана! Поезжай опять!" Мой бацька, якога залічылі да сераднякоў, усю зіму ў Жэдні сядзеў. З Чараўкоў было вызначана дзевяць сем'яў для вывазкі ў Сібір, але не ўспелі.

Вёска Залатнікі, мешаная, падлягала пад сельсавет у поўнасцю каталіцкіх Белях. І цэлы актыў у тамашнім сельсавеце быў з Залатнікоў. Старшынёю быў Давыд, бадай Клімчук, а сакратаром Вярбіцкі. У Залатніках жыў Вайцюк, якога палічылі кулаком і вывезлі ў ссылку; пасля вайны ён вярнуўся. Сын таго Вайцюка, Мікалай, здэзерціраваў быў з Савецкай Арміі і хаваўся. Калі ў 1941 годзе прыйшлі немцы, Мікалай Вайцюк даклаў на сваіх актывістаў эсэсаўцам у Беластоку і яны семярых чалавек — усіх з Залатнікоў — расстралялі. Калі саветы вярнуліся, то Мікалай Вайцюк уцёк перад імі. Знайшлі яго пасля каля Варшавы, працаваў у млыне. Судзілі яго, але сядзеў мала.

У Страблі стаяла савецкая дывізія. Салдаты жылі ў зямлянках у лесе ад Мулявіч. Штаб размясціўся ў панскім палацы. Ксяндза выгналі ў Самулкі і ў плябаніі памясцілі санчасць. Склады былі ў лесе пад Храбаламі. Часам салдаты прыходзілі ў Чараўкі па свойскі хлеб. Бывала, гаварылі: „Незачем воевать за советскую власть: не пойдём воевать!"

(працяг будзе)

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

„Ніжняе места” найбольш асацыюецца з „вялікім горадам Беластокам” Сакрата Яновіча, які хадзіў па тых самых сцежках...

Узнагарода — Гедройцю

Кшыштаф Гедройць, аўтар празатарскіх „Лістоў з ніжняга горада” стаў лаўрэатам за найлепшую кнігу 2003 года ў Беластоку. Гэтая кніга вядомага паэта (узнагарода імя Казіміры Ілаковіч за зборнік „Кім”, кніга паэзіі „Драбіна, шпакі, дахі і каміны”), прадэкана Тэатральнай школы ў Беластоку выдадзеная была не ў Беластоку, а ў Кельцах, у выдавецтве „Характары”, але далучылі яе да перадапошняга (30) нумара часопіса „Карткі”, і яны прапанавалі яе да ўзнагароды імя Веслава Казанэцкага, разам з кнігамі свайго выдавецтва — „Апавяданнямі з-над Нарвы” Міраслава Грыкі ды „Вершамі тутэйшымі” Міры Лукшы. Летась Беласток быў багаты на добрыя выданні, выбар быў надта вялікі, і не намінавана была, напрыклад, знакамітая кніга лірыкі Кацярыны Евы Здановіч (ранейшай лаўрэаткі гэтага конкурсу) „Як паміраюць малыя дзяўчынкі”, выдадзеная Вольгай Такарчук у яе выдавецтве „Рута” ці не перамаглі Гедройця славуты Ян Леанчук кнігай „Закутак” ці Веслаў Шыманскі сваімі „Вершамі”, мінулагодні член журы, і нават Мечыслаў Чайкоўскі „Супраскімі легендамі”. Старшыня капітула, крытык Дарыюш Кулеша, так ацаніў кнігу Гедройця, ягоны празатарскі дэбют: „Гэта добрая, знакаміта напісаная рэч. Кшыштаф Гедройць у «Лістах з ніжняга горада» зачароўве

свет, які ведае, свет блізкі, для таго, каб мы маглі яго палюбіць”. Гедройць атрымаў узнагароду „за кунштоўна расказаны філасофскі аповед, які вяртае надзею на раўнавагу паміж небам і зямлёй”. Гэта, у пэўным сэнсе, сказаў лаўрэат, кніжка пра Беласток. „Літаратура сёння павінна ратаваць свет і нас, загубленых у гэтым свеце. Павінна паказваць свет, у якім хацелі б мы быць. Павінна мець моц зачароўвання шэрага «тут і цяпер» для таго, каб мы спрабавалі паверыць у тое, што той зачараваны сон можа стаць рэальнасцю. Такая ёсць якраз проза Кшыштафа Гедройця”, — абагульняў у час уручэння ўзнагароды Д. Кулеша.

Гэты адначасова быццам бы аповесць-эсэ-краязнаўчы даведнік напісаны ў форме лістоў брату, які пражывае ў „верхнім горадзе”, значыць, у небе ці то ў сусвеце. Гэта быццам бы другая палова расказчыка, ягонае адлюстраванне, якое чакае хвілі ўз’яднання са сваёй ніжняй, зямной паловай. Жыхар нізу расказвае, што чуваць тут у нас, у ніжнім месце. „Лісты з ніжняга горада” — расказ аб правінцыяле, які тужыць па былым і вечным, сніць на яве, прагне незвычайнага ў сваім шэрым жыцці. І хоць Гедройць, лаўрэат узнагароды імя Веслава Казанэцкага, агаворваецца, што нічога супольнага з патронам не мае і не з’яўляецца ягоным натхненнем ягоная літаратура, ведаючы самога Казанэцкага, яго творы, сяброў, адчуваецца тую самую атмасферу і тон. А найбольш мне асацыюецца тое „ніжняе места” з „вялікім горадам Беластокам” Сакрата Яновіча, які хадзіў па тых самых сцежках, што і герой-брат, і дзе мы таксама шпацыруем, прыгнечаныя тугой і сумам па былым і высокім.

Міра Лукша

Сябрам беларусам

Магло ж быць так, што
і я нарадзіўся ў вашым племі
і неба прамаўляла да мяне кірыліцай,
крыж мой меў адну перакладзіну больш і
жагнаўся я трыма пальцамі, і слухаў
спеваў царкоўных, маім домам быў
сялянскі двор, што глядзеў я
на напыхлівае польскае племя
падазрона, зайздросна, што быў чужы
нягодны, пагрозлівы, на паслугах, так што
амаль паверыў я, што гэтак мусіць быць.

Пераклала Міра Лукша

Успаміны ваеннага пакалення

Ужо даступна ў продажы трэцяя па чарзе кніга ўспамінаў беларусаў Беласточчыны. Пасля „Бежанства 1915” і „У новай Айчыне” на паліцах з’явіўся том „Пакаленне вайны. Штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў перыяд вайны і акупацыі (1939-1944)”, у якім змешчаны ўспаміны 113 чалавек і тры больш абшырныя рэляцыі з гэтага ж перыяду Дзмітрыя Шатыловіча, Віктара Шведа і Алены Анішэўскай.

Сабраны ў 1996-2003 гадах журналістамі, карэспандэнтамі і чытачамі „Нівы” мемуарны матэрыял размешчаны ў пяці раздзелах: „Пачатак вайны (верасень 1939)”, „Пры саветах (1939-1941)”, „Нямецка-савецкая вайна (чэрвень 1941)”, „Пры немцах (1941-1944)” і „Ліпень 1944”. Дзмітры Шатыловіч і Віктар Швед набліжаюць чытачам абстаноўку ў гэты неспакойны час у сваіх родных вёсках — Чаромсе і Моры. Алена Анішэўская апісвае долю перасяленых немцамі ў Беласток жыхароў пушчанскіх вёсак.

У зборніку апісаны факты, якія запамяталіся звычайнымі жыхарамі вёсак і мястэчак. Не ўдзельнічалі яны ў падзеях, якія трапілі на старонкі падручнікаў па гісторыі, але былі сведкамі смерці, злачынстваў, страху, роспачы, якія спадарожнічалі ваеннаму ліхалеццю. „Многія аўтары ўспамінаў, — напісаў ва ўступе да кніжкі прафесар Яўген Міра-

новіч, — у час нямецкай акупацыі былі маладымі людзьмі. Такіх перш за ўсё немцы бралі на прымусовыя работы. (...) Шмат хто спрабаваў уцякаць, хавацца ў сваякоў, якія пражывалі ў іншых мясцовасцях. Лёсы людзей таго пакалення былі аднак вельмі да сябе падобныя. Амаль усе выступалі ў ролі зацкаванай звярыны. Уцякалі, хаваліся, былі бітымі, сталі сведкамі забойстваў ці прыніжэння найбліжэйшых ім людзей”. Успаміны малююць вобраз быццам бы спакойнай беластоцкай вёскі, аддаленай ад франтавых дзеянняў, але якой не абмінулі жудасці ваеннага часу.

Кніжку можна набыць у рэдакцыі (каштуе яна 20 зл.), або заказаць па пошце (кошт з перасылкай — 30 зл.). Расказчыкі і збіральнікі ўспамінаў аўтарскія экземпляры атрымаюць бясплатна. **(вл)**

Усе фоткі www.vikingsonline.org.uk

Нарманы ў гісторыі Беларусі

III частка

Паколькі *Повесть временных лет* твор літаратурны, нельга абмяжоўвацца гісторыяй. Зыходзячы з прадпасылкі, што, як у выпадку Рурыка з Сінеусам і Труворам, таксама ў выпадку Рагвалода з Рагнедай і Турым маем дачыненне з літаратурным сюжэтам, мы павінны пашукаць у скандынаўскай літаратуры творы, у якіх выступаюць постаці Рагнвалда, Рагнгільд і Туры.

Згаданыя імёны выступаюць у родзе нарманскіх ярлаў на Аркнейскіх астравах ля берагоў Шатландыі. Расказвае пра іх славутая *Сага пра аркнейцаў*. Продкі аркнейскіх ярлаў паходзілі з Нарвегіі. Жылі пад канец IX ст. Рагнвалд з Морэ (Ragnvald Mørejarl, з краіны Møren), „магутны і разумны ў радзе” быў самым блізкім таварышам нарвежскага караля Харалда Прыгожавалосага. Жонку Рагнвалда з Морэ звалі Рагнгільд (Ragnhild). Іхнім сынам меўся быць Рольф (Hrolf) Пешаход, заснавальнік нармандскай дынастыі і прапрапрадзед Вільгельма Заваёўніка. Пішу „меўся быць”, бо да Рольфа прызнаваліся і іншыя роды. Для нас гэта няважна, бо гутарка тут ідзе пра літаратуру, а не гістарычную праўду. З астатніх сыноў Рангвалда з Морэ, Івар, загінуў падчас выправы Харалда Прыгожавалосага на захад, Эйнар заваяваў пасаду ярла на Аркнейскіх астравах, Халад, які раней быў Аркнейскім ярлам, вярнуўся з астравоў дадому, Ролаг падаўся ў Ісландыю, а Туры (Tore, Thorir) Ціхмяны нікуды не рухаўся. Ажно просіцца дадаць — як тыповы дрыгавіч-паляшук.

Калі сыны Харалда Прыгожавалосага, Хальфдан Даўгалыгі і Гудрэд, забілі Рагнвалда з Морэ і перанялі яго ўладанні, Харалд перадаў усё Туры. Наймалодшы сын Рангвалда, Эйнар на канец забіў Хальфдана Даўгалыгага і стаў ярлам Шатландскіх і Аркнейскіх астравоў. У Эйнара былі тры сыны: Аркел, Эрланд і Турфін Чэрапакол. Два першыя загінулі разам з каралём Эрыкам Акрываўленым Тапаром. Каралева-ўдава Гунхільда аддала каралеўну Рагнгільд за сына Турфіна Чэрапакола, Арфіна. Пасля смерці Арфіна Рагнгільд пайшла замуж за яго брата Гаварда Добрае

Жніво. Паколькі Гавард малаціў збожжа, а не людзей, знудзіўся Рагнгільдзе. Яна намовіла Гавардавага сястрыніча Эйнара Рабалепнамоўнага, каб забіў дзядзьку, абяцаючы яму сваю руку. Калі Эйнар забіў Гаварда, Рагнгільд адмовіла яму і пайшла замуж за наступнага сына Турфіна, Лёта. Трупаў было больш, але на тым спынюся.

Іншы сын Турфіна, Хлёдвер, спарадзіў Сігурда, а той, між іншым, Брусі, а гэты Рагнвалда. Брусі вымушаны быў падацца да нарвежскага караля Олава (Святога) разам з тады дзесяцігадовым Рагнвалдам. Калі Брусі вярнуўся дадому, Рагнвалд застаўся служыць Олаву. Рагнвалд вырас на вельмі высокага і моцнага мужчыну, нават „самага прыстойнага з усіх мужчын”. Доўга служыў Олаву і ўдзельнічаў у бітве пад Стыклестэд. Рагнвалд вынес з бітвы раненага прынца Харалда. З рэштай ацалелых вояў Олава падаўся ў Швецыю, адтуль у Русь і паступіў на службу ў Яраслава Мудрага. Цешыўся даверам і Яраслава, і яго жонкі Інгігерды. Пасля доўгай і паспяховай службы ў рускага ўладара, Рангвалд памог вярнуць трон Магнусу, сыну Олава. У Нарвегіі пачуў пра смерць свайго бацькі Брусі і падаўся дадому. Тут доўга змагаўся за ўладу з Турфінам. Забіты быў па-здрадніцку „сярод скал” Шатландыі.

Не цяжка заўважыць, што легендарны расказ пра службу аркнейца Рагнвалда, сына Брусі ў Русі дакладна паўтарае жыццяпіс Рагнвалда з Ладагі. Абодва служылі Яраславу Мудраму і яго жонцы Інгігерд; нават імёны іхніх патомкаў, Ульф і Эйлів ідэнтычныя. Магчыма, служылі тады ў Русі два Рагнвалды. Усё ж такі больш праўдападобна, што жыццяпіс Рагнвалда, сына Брусі ўзбагачаны быў стваральнікамі сагі пачынамі Рагнвалда з Ладагі. Такім чынам і множыліся гэтыя варагі ды іх пачыны ў Русі.

(працяг будзе)

Алег Латышонак

Адкуль столькі цікавай і самай разнастайнай інфармацыі...

www.radio.com.pl/polonia/

Сайт беларускай службы „Радыё Палёнія" гэта, па вялікаму рахунку, тое месца, дзе зацікаўлены ў навінах з і аб Беларусі карыстальнік знойдзе для сябе амаль усю патрэбную інфармацыю. І нават больш за тое.

Бела-шэра-чырвонае выяўленне напачатку падаецца не такім ужо прывабным. У гэтым, магчыма, ёсць некаторая недапрацоўка тых, хто думаў над дызайнам „палянійнага" сайта. Але калі пачынаеш удавацца ў ягоны змест, то няма мяжы здзіўленню — адкуль столькі цікавай і самай разнастайнай інфармацыі. Пасярэдзіне экрана перад інтэрнэтным вандроўнікам адкрываецца тое, што называецца стужкай навін. Кароткія загалоўкі, дата і кароценькая анатацыя — толькі гэта адразу кідаецца ў вочы. Але менавіта гэтага цалкам дастаткова, каб зацікавіцца тым ці іншым паведамленнем. Калі стала цікава — клікні на „Болей" і перад табой адразу з'явіцца немалы па памерах артыкул ці падрабязная нататка.

Навіны абнаўляюцца дастаткова часта і тыя, якія ўжо „састарэліся" адыходзяць ніжэй са зменшанымі тытуламі. Найбольш цікавыя, на думку распрацоўшчыкаў сайта, інфармацыі памяшчаюцца побач у правай калонцы пад рубрыкай „Тэкст дня". Тут аператыўнасць абнаўлення крыху запавольваецца і складае, па маіх падліках, 2-3 разы на тыдзень. Шчыра кажучы, гэтага дастаткова, калі ўлічыць тое, што аб той ці іншай больш-менш значнай падзеі людзі ўспамінаюць каля 2-3 дзён. Потым на першы план выходзіць сёння з уласцівымі гэтаму дню падзеямі.

У левым баку сайта яго кароткі змест. Менавіта тут карыстальнік знойдзе тое, што яго найбольш можа зацікавіць з прапанаваных тэм. А тэм па розных аспектах грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця хапае. І тычацца яны не толькі Беларусі, а ўсяго, што можа быць цікавым для польскага замежжа (зважаем на назву). „Польшча", „Грамадства", „Свет" — гэтыя падраздзелы ўяўляюць сабой нібыта шуфляды ў стале пад ужо згаданай назвай „Тэкст дня". Тое ж самае адбываецца і з навінамі, а таксама з артыкуламі пад рубрыкай „Рэкамендуем", якія тычацца не толькі пералічаных раней бакоў грамадскага існавання, але і прапануюць задумацца над правамі чалавека, сутнасці дзяржавы і яе канстытуцыі. Таксама ў гэтай рубрыцы карыстальнік знойдзе для сабе карысныя парады, дзе можна няблага адпачыць. Зразумела, усё тычыцца польскіх „цекавостэк".

Не забыліся распрацоўшчыкі сайта і аб сваёй гісторыі, што само па сабе вельмі цешыць. У рубрыцы „Пра нас" можна даведацца аб тым, як узнікла „Радыё Палёнія", калі пачалося вяшчанне польскага радыё на замежныя краіны, завочна пазнаёміцца з усім калектывам беларускай рэдакцыі.

Ну а той, хто захоча пачуць галасы дыктараў, карэспандэнтаў і іх суразмоўцаў можа зрабіць гэта, клікнуўшы на чырвоны прамавугольнік з надпісам „Слухай".

Варта дадаць, што сайт „Радыё Палёніі" мае неблагі архіў. Неблагі па колькасці сабраных, напрыклад у „Навінах", матэрыялаў. Праўда, месяць ён паведамленні не раней сакавіка мінулага года.

Са старонкі беларускай службы, як, дарэчы, і з іншых замежных служб „Палёніі" лёгка выйсці на сайты іншых праграм польскага радыё.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларускія спартсмены ад Хельсінкі да Афінаў

Беларусь, беларусы...

Беларуска Алена Валчэцкая выступіла ў залатым складзе гімнастак
www.olympic.org

Японскае сонца ў наша ваконца
(1964, Токіо, 3 медалі)

Свой высокі клас пацвердзіла **Тацяна Самусенка**, якая стала срэбнай прызёркай. А на верхнюю прыступку п'едэстала ўзышлі адразу трох беларусаў. **Рамуальд Клім** выйграў спабор кідальнікаў молата, **Аляксандр Мядзведзь** перамог у вольнай барацьбе, а **Алена Валчэцкая** выступіла ў залатым складзе гімнастак.

Валчэцкая, ураджэнка Гродна, значны час працавала ў родным горадзе, вучыла гімнастыцы ў мясцовым універсітэце. Але ўрэшце пераехала на сталае жыхарства за акіян — летась свае 60-я ўгодкі яна сустрэла ў Амерыцы. Мядзведзь, які нарадзіўся на Украіне, пасля сканчэння выступаў на спартовых арэнах, зрабіў кар'еру ў наменклатурных калідорах. Сёння ён адзін з набліжаных да прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Не згубіўся і Клім, які паходзіць з вёскі Хвоева, што на Нясвіжчыне. Доўгія гады ён перадаваў свой досвед іншым.

Высокія вынікі на высакагор'і
(1968, Мехіка, 10 медалёў)

Найбольшы поспех з беларусаў выпаў на долю гімнасткі **Ларысы Петрык**, якая заваявала два залатыя медалі (у камандавым заліку і ў вольных практыкаваннях) і адзін бронзавы (за выступ на гімнастычным бервяне). Ларыса Петрык, якая нарадзілася на Сахаліне, у 1977 г. вярнулася ў Расію, а ў 1992 г. выправілася па лепшую долю ў Злучаныя Штаты Амерыкі.

Камандава найлепей выступілі нашы „мушкецёры". Двойчы на верхнюю прыступку п'едэстала ўзыходзіла **Алена Новікава (Бялова)**, перамогшая ў асабістым і камандавым заліку ў фехтаванні на рапірах. Зноў золата павезлі дахаты **Тацяна Самусенка** і **Аляксандр Мядзведзь**, а **Юры Смалякоў** і **Аляксей Ніканчыкаў** сталі срэбнымі прызёрамі. Бронзавы медаль залічыў на свой рахунак стралок **Віталь Пархімовіч**.

Падрыхтаваў Уладзімір Хільмановіч

Стадыён Ацтэкаў
www.olympic.org

Занатоўкі кантрабандыста

Як пан, то і прапаў

Праца — гэта рынак, а адпачынак — гэта пушча. Так было заўсёды для кантрабандыста, які абіраў для гандлю тэрыторыю Гайнаўскага павета. Тут свае адметнасці цяжкой працы па дастаўцы алкаголю туды, дзе яго ўмеюць рабіць самі жыхары. Могуць накачаць цябе ім па гарляк і задарма. Ды яшчэ закускі нарэжуць такой, якой ты ніколі не сустрэнеш ні ў адной польскай краме. Тут, каб прадаць свае дваццаць літраў за дзень, трэба добра ведаць менталітэт мясцовага пакупніка. А вось Лявон Зінкевіч з Ваўкавыска гэтага не ведаў.

Я пазнаёміўся з ім у некалькіх метрах ад рынкавай сметніцы. Ён прыкладваў халодную бутэльку да падбітага вока, і з хмурым, як чарназём, тварам праклінаў сваю нялёгкую долю. Сіняк быў такі наліты, што здавалася Лявон зваліўся з самага высокага дуба і ляснуўся чэрапам аб камень. Прычым, некалькі разоў запар і тым самым месцам.

Мне якраз не было кампаніі пераначаваць у лесе. Аднаму даволі небяспечна. То бандыты па лясах блукаюць, то паліцыянты. Ды і сумна аднаму. А тут, такі нечаканы падарунак лёсу — чалавек, на морду якога прыклеілася цэлая, яшчэ не прададзеная, і нават не пачатая літроўка спірту.

Мы распалілі агеньчык. На яго, як восы на мёд, пасунуліся яшчэ колькі гандляроў-адзінотнікаў. Усе разам павячэралі, склаўшы каля дзесятка тостаў, ды сталі абменьвацца ўражаннямі пра мінулы дзень.

— Кепскі ў мяне быў дзень, — распачаў Лявон, — ніяк не магу зразумець за што дастаў па смаркачах. А было так. Гандлюю я ў Гайнаўцы, нікога не чапаю. Наадварот, хаваюся ад усіх, каб не патрапіць у цеплыню і ўтульнасць паліцэйскай машыны. Гандаль ішоў кепскавата. І тут, раптам падлятае да мяне адзін мужык. Пытае, ці маю гарэлку. А я толькі яе, родненькую, і маю.

— Давай чатыры, — кажа дзядзька.

Я вельмі ўзрадаваўся. „Дзенькуе пану", — кажу. А ён мне:

— Ты, прыдурак, каго панам называеш!? Яшчэ раз так скажаш, можаш ехаць гандляваць за Варшаву. А завітаеш сюды, то вып'еш сваю гарэлку сам.

Вельмі я на яго пакрыўдзіўся за гэтыя словы, але праўда, як кажуць, заўсёды на баку кліента. Прадаў яму чатыры бутэлькі і думаю сабе: „Ідзі ты, дзядзька, пі, і не дуры мне больш галавы". Але ён хутка вярнуўся. На гэты раз добра падпіты.

— Давай яшчэ дзве.

— Пан, — мой найлепшы кліент, — узрадаваўся я.

А ён спахмурнеў, стаў ад злосці чорны, як зямелька.

— Ці не казаў табе не называць мяне панам. Я з Белавежы. Мы тут усе беларусы. Я дзяцей сваіх лупцую, каб гаварылі па-нашаму. А цябе зараз закапаю за такое. Зразумеў ці не?

Я сказаў, што зразумеў, а сам стаў прыпамінаць дзе я, у Польшчы, ці пераехаў. Калі пераехаў, то куды. А ён забраў гарэлку і на развітанне па-прыяцельску ляпнуў мяне па плячы. Гэта быў першы раз, калі я адчуў моц яго шырокай жылістай лапы. Плячо і зараз ные. У мяне мільганула думка: не дай Бог злавіць яго кулак сваёй мордай. Сумаваць без яго мне не давялося. Дзесьці праз гадзіну перада мной вырасла знаёмая, толькі ўжо добра падпітая постаць.

— Гэта зноў пан! — шчыра ўзрадаваўся я і сунуў яму бутэльку. — У мяне якраз апошняя засталася, толькі для пана.

І тут я другі раз адчуў моц яго рукі. Рэзануў ён мне хутка, прыцэльна, нібы калоў парсюка. У вачах зразу пацямнела. А як трошачкі стала яснець, я, лежачы пасярод Гайнаўскага рынка, убачыў над сабой цьмяныя абрысы чалавека.

— Забірай сваю гарэлку і прыкладзі яе да вока, — гнеўна выдыхнула постаць, — а то праз мяжу не прапусцяць. Бо ты зараз вельмі істотна адрозніваешся ад фотаздымка на пашпарце.

Я так і зрабіў. Толькі ніяк не ўцямлю, што ад мяне хацеў гэты пан.

Назаўтра мы зноў паехалі на рынак. Я прадаў рэшткі свайго тавару і на ад'езд вырашыў развітацца са сваімі новымі знаёмымі. Гандаль у іх ішоў даволі добра. Яны весела гаманілі з пакупнікамі, але я заўважыў адну акалічнасць. Ніхто з іх не ўжываў у размовах слова „пан".

Сымон Нальшанскі

НАСТАЎНІЦА РАІЦЬ

Пра традыцыі і абрады

Адной з галоўных мэт сённяшняй школы ў нашай краіне з'яўляецца тое, каб падрыхтаваць маладога чалавека заўважаць сваю культурную і нацыянальную адметнасць на фоне іншых культур.

Думаю, што спрыяе гэтаму вывучэнне на ўроках беларускай мовы народных звычаяў і абрадаў, якія характэрныя беларусам Беласточчыны.

Што ж такое **традыцыя**? Гэта ад лацінскага слова „пераказ".

Часта думаем пра тое, што нам пераказалі нашы дзяды і прадзеды. А што мы перакажам нашым нашчадкам? Гэта думкі, вераванні, абычаі характэрныя грамадскасці і яны маюць уплыў на яе сённяшняе і будучае жыццё.

Традыцыя — гэта тое, чаго мы не павінны забываць. Яна нам патрэбна. Дзякуючы ёй адчуваем сваю тоеснасць, сваю супольнасць як народ, ведаем чым адрозніваемся ад іншых нацыянальнасцей. Традыцыя гэта сукупнасць абрадаў, якія сфарміраваліся на працягу доўгага часу. Пра абрады гаворым з вялікім хваляваннем. Гэта ж абрады з'яўляюцца неадлучным элементам нашай мясцовай беларускай культуры.

Сёння, калі ў нашых школах выхоўваем маладых людзей, нельга не звярнуцца да хрысціянскіх традыцый. Адной з іх з'яўляецца ўрачыстая Куцця арганізаваная ў школе ў апошні дзень навукі ў каляндарным годзе.

У час Куцці:

— прыпамінаем біблейскую гісторыю Нараджэння Збавіцеля;

— гаворым, да чаго павінен імкнуцца кожны чалавек, як жыць сёння, каб даступіць божай ласкі збаўлення;

— віншуем адзін аднаго з нагоды Ражджаства;

— супольна спяваем калядкі, якія сведчаць пра адзінства чалавечых думак і зямнога лёсу;

— рыхтуем і заахвочваем вучняў да абраду калядавання ў час святаў, каб прадоўжыць нашую адвечную традыцыю.

Маладыя людзі ўдзельнічаюць у чароўным вечары Куцці ў сваіх хатах. Тады ўся сям'я сабіраецца пры стале. Сядзяць тварам у твар, ядуць аднолькавыя посныя стравы, віншуюць адзін аднаго. Падрыхтоўка святочнага вечара таксама аб'ядноўвае многія асобы. І старыя, і маладыя знойдуць у гэты дзень работу. А прыемны пах посных страў, якія рыхтуюць на вячэру, напамінае аб надыходзячым урачыстым вечары і Святах.

Традыцыі, абрады і народнае мастацтва з'яўляюцца часткай нацыянальнай культуры. Пазнанне духовай і матэрыяльнай культуры нашых продкаў уплывае на фарміраванне свядомасці вучняў. Вучань пазнаючы абрады, звязаныя з Калядамі, адчувае блізкасць з многімі людзьмі.

Прыгожай дзялянкай нашай мінуўшчыны з'яўляюцца веснавыя абрады. Гэта не толькі велікодныя звычаі, але і тыя, якія датычаць такіх свят, як Юр'е, Провады, Ушэсце, Сёмуха.

Вучняў можна зацікавіць веснавымі абрадамі. Можна звярнуцца да бадзёрых, вясёлых настрояў маладых людзей, якім вясна гэта абуджэнне прыроды, даўжэйшы дзень, першыя каханні і сустрэчы. Можна лёгка ўсвядоміць навучэнцам, што вясна ў мінулым была вясёлым перыядам, асабліва для вясковай моладзі. Хлопцы і дзяўчаты выходзілі на лавачкі, спявалі „огулькі", „вяснянкі", перакліквaліся між сабой, давалі волю сваім эмоцыям.

Працуючы ў гімназіі, я рэалізавала тэмы па веснавой абраднасці. Вучні знаёміліся з матэрыялам з падручнікаў, распытвалі сваіх бабуль і дзядуляў пра веснавыя абрады, а падсумаваннем цыкла ўрокаў была сустрэча з фальклорным калектывам „Арэшкі", які дзейнічае ў нашай гміне. Вучні маглі выслухаць аўтэнтычныя „огулькі" і „вяснянкі", пачуць расказ пра, не заўсёды лёгкае, жыццё і заняткі моладзі ў мінулым.

Сёння, калі наракаем на мноства абавязкаў, на недахоп часу, варта задумацца над словамі адной з удзельніц калектыву „Арэшкі": *Колісь жыті было тяжко, але вэсело.* Маладых аб'ядноўвалі пэўныя звычаі і абрады, у якіх яны былі галоўнымі героямі.

Сёння ў свеце многа новага, людзі часта захапляюцца тым, што моднае, нязведанае, чужое. Прыкладам з'яўляюцца „Валянцінкі" ці „Хэлоўін". Але, на маю думку, варта памятаць аб тым што ўжо было цікавым і праверaным. А на традыцыйных нашых абрадах узгадаваліся многія пакаленні.

Ніна Куптэль,
настаўніца беларускай мовы Пачатковай школы і Публічнай гімназіі ў Дубінах

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Мужчына шукае працу ў Беластоку, сярэдняя адукацыя, уласная машына, стаж працы механікам легкавых машын, тэл. 6533162.

• Шукаю працу ў пякарні (Беласток), вопыт, санітарны мінімум, кніжка здароўя, правы кат. В, тэл. 6618908.

• Студэнтка ахвотна паможа старэйшай асобе за невялікай аплатай (прыбярэ, смачна зварыць), вольны час пасля абеду (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602322407.

• Жанчына (43 г.), тэхнічная адукацыя, закончаныя курсы камп'ютэрнага рахункаводства, правоў працы і экатурызму, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, шмат свабоднага часу, тэл. 7304000 (Бельск-Падляшскі).

• Студэнтка шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай і рускай моў, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0602769109.

• Студэнт шукае працу ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, уласная машына, абслуга камп'ютэра, аператыўны (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0606431022.

• Мужчына (32 г.), сярэдняя адукацыя, з дзяцінства працаваў на гаспадарцы, шукае працу ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, уласная машына, тэл. 7309636.

• Студэнтка маркетынгу шукае працу ў Беластоку, стаж працы ў магазіне, добрае веданне рускай і англійскай моў, абслуга камп'ютэра, арганізацыйныя здольнасці, добры падыход да дзяцей (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0692687442.

• Студэнт-завочнік ахвотна паможа ў цяжэйшых працах на гаспадарцы, правы кат. В, мноства свабоднага часу, тэл. 0505057491.

• Студэнтка пражываючая ў Беластоку ахвотна заапякуецца малым дзіцём у ранніх гадзінах (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 7445293.

• Студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, стаж — тры гады апекі над малымі дзяцьмі, шмат свабоднага часу і ахвота да працы, дапаможа ў хатніх працах, тэл. 6627036.

Дапамагаем сабе ўзаемна

• Сям'я з пяці чалавек патрабуе пледаў, пасцелі і цёплага адзення для дзяцей ва ўзросце ад 5 да 12 гадоў.

• Самотная маці з трыма сынамі ва ўзросце 9, 11 і 13 гадоў будзе ўдзячна за ўсялякую дапамогу.

• Сям'і патрэбны стары халадзільнік і абутак для дзяцей (5, 8, 13 і 15 гадоў).

• Сужонства з 4 дзяцьмі патрабуе мэблі, пасцелі, цёплых ботаў для 5- і 7-гадовых хлопцаў і 11- і 13-гадовых дзяўчат.

• Сям'я, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе штаноў і куртак для хлопцаў ва ўзросце 10 і 13 гадоў, ботаў і адзення для 5-гадовай дзяўчынкі.

• Самотная, 66-гадовая жанчына патрабуе дроў, вугалю і цёплай пасцелі, а таксама грошай на лякарствы.

• Старэйшае сужонства патрабуе бясплатнай дапамогі ў хатніх працах.

• Сям'я з сямі чалавек патрабуе мэблі, цёплых пледаў і тэлевізара.

• Сям'і патрэбны харчы (бульба, мука, мяса), гігіенічныя сродкі і старая мэбля. Больш інфармацыі — тэл. 7302006.

• Жанчына патрабуе цёплага адзення для сыноў ва ўзросце 7 і 10 гадоў.

• Сям'я патрабуе пасцелі, пледаў, зімовых куртак і ўсялякага нязнішчанага адзення для дзяўчат ва ўзросце 7, 11 і 14 гадоў.

• Адзінокая маці, якая выхоўвае чацвёра дзяцей, патрабуе цёплага адзення для 7-, 9- і 12-гадовых хлопцаў і для 15-гадовай дачкі, пледаў і пасцелі.

• Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля). Больш інфармацыі — тэл. 7121153.

• Студэнткі другога курса філалогіі будуць удзячны за стары, але спраўны камп'ютэр, тэл. 56627036.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Пошук студэнтаў-беларусаў

Даследчая група Факультэта педагогікі і псіхалогіі Універсітэта ў Беластоку ў сувязі з ажыццяўленнем свайго праекта па даследаванні сумежжа шукае студэнтаў і выпускнікоў Філіяла Варшаўскага універсітэта ў Беластоку ды Універсітэта ў Беластоку, якія заяўляюць сваю беларускую нацыянальнасць. Просім кантактавацца з намі **26.02.2004 г. ад 10.00 да 14.00 гадзіны** па тэлефоне (085) **745 74 03** або напісаць па электроннай пошце **jolamusz@uwb.edu.pl**

Віншаванні, прывітанні, пажаданні...

Шматгадовай карэктарцы „Нівы"

Валянціне ЖЭШКА

з нагоды Яе дня нараджэння

моцнага здароўя і радасных хвілін

жадаюць калегі з рэдакцыі.

Беларускай паэтэсе

Надзеі АРТЫМОВІЧ

з нагоды дня нараджэння

здароўя, добрага настрою,

ненавязлівага натхнення...

Абвесткі

Гала-канцэрт „Беларуская песня 2004"...

... адбудзецца 21 лютага ў зале Спартыўнага клуба „Влукняж" у Беластоку па вул. Антанюкоўскай, 60 (пачатак у 16 гадзін). Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства шчыра запрашае ўсіх зацікаўленых.

„Харошкі" і „Сябры" ў Гайнаўцы

22 лютага г.г. (нядзеля) Гайнаўскі дом культуры па вуліцы Беластоцкай, 2, запрашае на канцэрт у выкананні ансамбляў „Сябры" і „Харошкі" з Рэспублікі Беларусь. Пачатак а 14 гадзіне. ***(яц)***

З ГЦК у... сузор'е

У лютым г.г. у Гмінным цэнтры культуры (ГЦК) у Міхалове (па вул. Беластоцкай, 19) пачаў працаваць астранамічны гурток. Вядзе яго Марцін Сякерка, член Польскага таварыства любіцеляў астраноміі. Заняткі адбываюцца ў кожную пятніцу ад 17 гадзіны. Пагодлівым вечарам ды ноччу праз прафесіянальны тэлескоп можна агледзець сузор'і, каметы, галактыкі. ***(яц)***

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 393 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2004 r. upływa 5 marca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na II kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Квас на Вейскай

Дзівы дзіўныя ў нас,
У Сейме ўваскрос дзядзька Квас.
Стукнуў, гукнуў на бакі,
З'явіліся сваякі.
Хто паўправы, хто паўлевы,
На чале сенатар Плева
З паўлітроўкай мармытухі.
Усё як трэба, усе пад мухай.
Ведай нашых! Жыве Квас!
І пачаўся амбарас.
Левы бок раве „Niech żyje!"
Правы — „Niech nam tańczy!" — вые.
Счапіліся б за чубы,
Бяда — лысыя грыбы.
Чупрыністы толькі Пэнк
Не ведае co to lęk.
Прэ ў атаку як на баль,
Kto na drodze, w mordę wal!
Перад ім нат хвацкі Лепэр
Не пружыніць chłopską krzepę.
У ложы прэзідэнцкай віск,
Прэзідэнту скокнуў ціск.
На ўрадавых падмостках
Прэм'ер зрок убіў у troskę.
Тут маршалак пан Бароўскі
Грымнуў кульбай маршалкоўскай.
І сказаў, што Izbę kalać
Racja stanu nie pozwala.
І ганьбуе замест Пэнка,
Нявед чаму, Лукашэнку.
Спраўна ўвайшоў у ролю
Яўген Чыквін, пасол з Орлі,
У клубалюбным польскім форуме
Ў гэты дзень у поўнай форме.
Патлумачыў сходу ён:
— Звонім, сябры, не ў той звон,
І герой не pałacowy,
А з Малынкі, наш, вясковы.
Дзівы дзіўныя тварыў,
„Нівай" дыхаў, „Нівай" жыў.
Хоць даўно пакінуў нас,
А ўсё з намі дзядзька Квас.
Так па ўсходнесценных вёсках
І поўзае пагалоска,
Што ў Сейме, у наш час,
Аб'явіўся дзядзька Квас.
Згукнуліся хадакі —
І ў Сейм. Жывуць вякі!
Дык з-за каго амбарас?
Віноўнікам дзядзька Квас.

Сідар Макацёр

Кантрабанда ці палітыка?

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

„Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

Гутараць двух сябраў:

— Не веру ў сілу рэкламы! — заракаецца адзін.

— Не маеш рацыі, — адказвае другі.

— І так мяне не пераканаеш.

— Паслухай: нават у прыродзе маем дачыненне з рэкламай. Ці ты чуў, як кудахтае курыца, калі знясе яйка?

— Чуў.

— А ці качка кракае пасля знясення яйка?

— Не.

— Вось і бачыш: усе купляюць курыныя, а не качыныя яйкі.

* * *

Пажылы мужчына з маладою дзяўчынаю ўваходзяць у гасцініцу.

— Гэта ключы ў ваш і вашай дачкі нумар, — гаворыць парцье.

— Ці вы не заўважаеце, — абураецца мужчына, — што я застары каб мець такую дачку? Гэта мая жонка!

* * *

У цягніку пажылы мужчына прабуе зачапляць маладую дзяўчыну. Наканец абрыдлі ёй гэтыя заляцанні і пытае яго:

— А мо хочаце пабачыць, у якім месцы аперыравалі мне апендыкс?

— З прыемнасцю.

— Выгляньце праз акно: гэта было ў гэным шпіталі.

* * *

Па тратуары ідзе Андрэй, а за ім бяжыць сабака. Андрэя спыняе паліцыянт:

— Чаму гуляеце з сабакам без павадка і намордніка?

— Гэта не мой сабака, — адказвае Андрэй.

— Безумоўна ваш, бо ідзе за вамі.

— Ой! Ён прычапіўся да мяне гэтаксама як і вы.

* * *

Жонка да мужа, выходзячы з універмага:

— Ці ведаеш, чаму я плакала, калі былі на другім паверсе?

— Ведаю, ды не маю столькі грошай.

* * *

— Куды паедзеце ў пасляшлюбнае падарожжа? — пытае бландзінку сяброўка.

— У Францыю.

— Гэта выдатна! Але чаму ты не цешышся?

— Бо ён сказаў, што мусіць абавязкова паказаць мне тое месца, дзе ваяваў у час другой сусветнай вайны.

* * *

Хворы расказвае псіхіятру пра свае трывогі:

— Штоноч праследуе мяне аднолькавы кашмар! Сніцца мне, што па ўсім доме гоніць мяне цешча з кракадзілам на павадку. Яшчэ цяпер бачу тыя страшэнныя жоўтыя вочы, абцякаючую слінай морду, шурпаты лоб і зубіска як штылеты...

— Гэта сапраўды страшэнна, — падтаквае лекар.

— Так: а кракадзіл выглядае яшчэ горш!

* * *

У дзверы Кавальскіх стукае жабрак і просіць:

— Выбачайце, ці не маглі б вы даць беднаму нешта падсілкавацца?

— А ці я тыдзень таму не дала вам кавалка юбілейнага торта? — перапытвае гаспадыня.

— Так было, але я ўжо акрыяў.

* * *

Лекар абследаваў Івана і пытае:

— Колькі вам гадоў?

— Пяцьдзесят.

— І больш не будзе!

* * *

Лекар абследвае Марусю і круціць галавою:

— Не падабаешся мне, жанчына.

— А я і сама не лічу сябе надта прыгожай.

Адгаданка

На белых мядзведзях

(паліндрам)

У шубах на паляванне з'ехалі куміры нашы:
Джордж Буш, Сільвестр Сталоўн і Туркменбаша.
Трашчыць мароз, чакаюць звера волаты ў тайзе,
Заселі за стваламі, а побач іх мядзведзь —
_ / _ _ _ _ / _ _ _ _ ўкраў і кінуўся ў тайгу.
І мерзне бедны янкаў Джордж, аж нос ссінеў яму.

(Ш)

Рашэнне паліндрама (у нашым выпадку з дзевяці літар) аднолькава чытаецца злева направа і справа налева.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, разыграем кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 1 нумара

Зорамі мароз.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Антону Казлоўскаму** з Гарадка і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

22.02 – 28.02

Баран (21.03-19.04). Ад 21 да 26 лютага (Марс у квадратуры да Нептуна) — непрыемны момант: пільнуйся, каб не стаць ахвярай інтрыг альбо самому іх не выклікаць. Трыгон Марса і Юпітэра давядзе да таго, што паміж 25 і 28 лютага лягчэй будзеш мець доступ да ўплывовых людзей і іхных грошай. Варта запланаваць падарожжа. Знакаміта пойдуць экзамены. Моцнае ажыўленне ў пачуццях. Шмат прыемнасцей.

Бык (20.04-20.05). Добрае здароўе; пачні трэніраваць ёгу. Прыспешаны абмен матэрыі (усё худзееш!). З грашыма лепш пад канец тыдня, пачуцці — на нулі (усё ж — някепска). Без болю выкруцішся з абмяжоўваючых сувязей.

Блізняты (21.05-21.06). Ад 7 да 25 лютага Меркурый (твая апякунчая планета) у знаку Вадалея, што значыць для цябе свабоду і магчымасць рабіць тое, што хочаш, а не тое, што табе накідваюць людзі ці абавязкі. Захочаш кудысьці паехаць. Здайся на натуральную медыцыну.

Рак (22.06-22.07). Варта ўзяцца за грунтоўныя парадкі. Чакаюць цябе вялікія эмоцыі, але і клопаты. Хіба не хочаш быць „тым трэцім", што ламае сэрцы ці сее неспакой? Ахвота параўнаць свайго партнёра з іншымі. Магчымасць непрасканых начэй, што б гэта ні значыла.

Леў (23.07-22.08). 25-26 лютага, трыгон Сонца і Сатурна прынясе табе поспехі на працы і рэальныя магчымасці далейшага прагрэсу. Адазвецца сябра з даўніх гадоў, а адноўлены кантакт паказвае на поспехі. Калі шукаеш працу, чакай канкрэтную дамову.

Дзева (23.08-22.09). Пад канец месяца дачакаешся поспехаў! Але з замяшаннем і мноствам спраў. Варта пераняць ініцыятыву — дома, на працы, у любові. Найлепшыя падзеі чакаюць Дзеваў народжаных каля 10 верасня.

Шалі (23.09-23.10). Да 25 карысныя прафесійныя кантакты. Знакамітая прафесійная форма! Без жалю расстанешся з усім, што табе перашкаджае (выкінь з хаты „граты"). Схільнасць да ірытацыі. Бура, якую выклічаш, ачысціць атмасферу.

Скарпіён (24.10-21.11). Прыдасца табе больш цярплівасці. Тэмперамент крыху аслабне, хоць паявіцца хтосьці такі, што тваё сэрца хутчэй заб'ецца. Мусіш чакаць, пакуль іншыя штосьці аформяць (падпішуць, прыедуць...). Крытычна глянеш на сябе (можа, зменіш прычоску). За змены найлепш бярыся ў апошні дзень лютага (29). Прымай вітаміны, зважай на зубы і горла.

Стралец (22.11-21.12). Паміж 25 і 28 лютага Марс і Юпітэр установяцца ў трыгоне. Добры час рэгістраваць уласную фірму і на дзеянні, разлічаныя на хуткі поспех. Калі плануеш пабольшыць сям'ю, зафіксуй гэтыя дні ў каляндарыку! Камунікатыўнасць і шчасце да людзей.

Казярог (22.12-20.01). 25-26 лютага, з-за трыгона Сонца і Сатурна, возьмешся за амбітную задачу з дальнабачнымі вынікамі. Будзеш мець падтрымку (таксама фінансавую) ад значных асоб, аўтарытэтаў. Калі табе штосьці дакучае, псіхічна і фізічна — не бойся, усё „зажыве". Будзеш „бальзамам" на чужыя болі і турботы.

Вадалей (21.01-19.02). 24 і 25 лютага Сонца і Меркурый мінуць на небе Уран. Маеш шанц задзівіць асяроддзе смелымі ідэямі. Таксама на працы і ў інтарэсах. Гэта будзе пробліск інтуіцыі, а ад чагосьці такога пачалася кар'ера не аднаго Вадалея. Працяг знакамітага тыдня!

Рыбы (20.02-20.03). 21-28 лютага задзейнічае квадратура Нептуна і Урана. Не вер плёткам, не дайся ўцягнуцца ў інтрыгі. Пільнуйся ў банку, у краме. 21 зайдзі ў кіно, паслухай музыкі. Хтосьці табою зацікавіцца. Рыба з пачатку знаку можа атрымаць цікавую прафесійную прапанову. Рашайся хутка!

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960